

Як на Шклоўшчыне змагаюцца з «зялёным змеем»

СТАР. 3



Адзнака па фізкультуры: «за» і «супраць»

СТАР. 5



Свет мастака Сержука Цімохава

СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 студзеня 2014 г. СУБОТА № 4 (27614) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## СПАРТСМЕНЫ, АРТЫСТЫ І ЖУРНАЛІСТЫ ЎДАСТОЕНЫ ДЗЯРЖУЗНАГАРОД І ПАДЗЯК ПРЭЗІДЭНТА

**За добрасумленную плённую працу, дасягненне высокіх творчых і спартыўных вынікаў, значны асабісты ўклад у развіццё сферы культуры і спорту, рэалізацыю дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі, актыўнасць у грамадскім жыцці дзяржаўных узнагарод Рэспублікі Беларусь удастоены 9 чалавек. Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена рэдактару аддзела рэдакцыі газеты «Звязда» Святлане Протас і спецыяльнаму карэспандэнту ЗАТ «Другі нацыянальны тэлеканал» Марыне Цімафеевай.**

**Адпаведны ўказ падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка, паведамілі БЕЛТА ў прэс-службе беларускага лідара.**

Медалём «За працоўныя заслугі» ўзнагароджаны члены каманды Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па хакеі Алег Антоненка, Сцяпан Панамароў і Уладзімір Цыплакоў, спартсмен-інструктар хакейнага клуба «Гомель» Леанід Грышукевіч.

Гэтай жа ўзнагародай адзначаны заслугі артыста-вакаліста Магілёўскай абласной філармоніі Іскуі Абалян.

Медаля Францыска Скарыны ўдастоены артысты-вакалісты Маладзёжнага тэатра эстрады Вікторыя Алешка і Дзмітрый Танюкевіч, аглядальнік рэдакцыі газеты «Советская Белоруссия» Аэліта Сюльжына, намеснік галоўнага дырэктара галоўнай дырэкцыі «Агенцтва тэлевізійных навін» Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Іван Эйсмант.

Кіраўнік дзяржавы таксама падпісаў распараджэнне «Аб аб'яўленні Падзякі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь».

Падзяка аб'яўлена артысту-вакалісту (салісту) Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь Дзмітрыю Качароўскаму за высокія творчыя дасягненні і значны асабісты ўклад у развіццё беларускай культуры.

## ЖЫЛЛЁМ НЕАБХОДНА ЗАБЯСПЕЧВАЦЬ ТЫХ, ХТО РЭАЛЬНА Ў ІМ МАЕ ПАТРЭБУ

**Жыллём павінны быць забяспечаны, у першую чаргу, грамадзяне, якія рэальна маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Беларусі Міхаіл Мясніковіч журналістам перад семінарам па пытаннях удасканалення будаўнічай галіны краіны, які праходзіў учора ў Брэсце, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

Фарміраванне чаргі маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў — гэта адно з пытанняў, якое абмяркоўваюць удзельнікі семінара. Найбольш вострa, паводле слоў прэм'ер-міністра, гэта праблема сёння стаіць у Мінску, следам ідзе Брэсцкая вобласць.

У той жа час прэм'ер адзначыў, што спісы неабходна пераправерыць. «Намі неаднаразова звярталася ўвага мясцовых улад на тое, што ёсць шэраг грамадзян, якія, хутчэй за ўсё, не маюць патрэбы ў паляпшэнні жыллёвых умоў, але тым не менш стаяць на чарзе», — сказаў Міхаіл Мясніковіч. Ён падкрэсліў: «У спісах павінны быць тыя людзі, якія сапраўды маюць патрэбу ў гэтым». Сёння ж, паводле слоў прэм'ера, у чаргу трапляюць часам і тыя, хто штучна пагаршае свае жыллёвыя ўмовы, а таксама выкарыстоўвае іншыя нядобрасумленныя прыёмы. «Мы ставім задачу, каб у першую чаргу вырашаліся пытанні атрымання жылля тымі грамадзянамі, якія рэальна ў гэтым маюць патрэбу», — сказаў кіраўнік урада.

Пры гэтым ён звярнуў увагу, што пакуль не заўсёды паспяхова вырашаюцца пытанні будаўніцтва жылля стандартных спажывецкіх якасцяў. «Так, хочацца, каб жыллё было павышанай камфортнасці, — сказаў прэм'ер. — Але ўсё гэта звязана з коштам квадратнага метра, які аплачваецца чалавекам. Таму трэба разгледзець пытанне аптымізацыі праектных, інжынерных рашэнняў, каб у грамадзян быў выбар. Той, хто мае абмежаваныя фінансавыя магчымасці, таксама павінен мець шанц выбраць сабе кватэру».

На парадку дня і іншыя не менш актуальныя пытанні, у прыватнасці адносна выканання даручэнняў кіраўніка дзяржавы, дадзеных ім 10 снежня 2013 года на нарадзе па вырашэнні праблемных пытанняў будаўнічай галіны. «Кіраўніком дзяржавы пастаўлены вельмі складаныя задачы і даволі сціслыя тэрміны перад урадам, аблвыканкамамі і Мінскім гарвыканкамам па навядзенні парадку і ўдасканаленні дзейнасці будаўнічай галіны, — нагадаў прэм'ер-міністр. — Як і было даручана кіраўніком дзяржавы, на 1 студзеня сфарміравана ўся неабходная нарматыўна-прававая база (гэта 21 нарматыўна-прававы акт усіх узроўняў). Такім чынам, першы этап зроблены, цяпер неабходна практычная работа для таго, каб забяспечыць вырашэнне пастаўленых задач».

Міхаіл Мясніковіч адзначыў, што ў будаўнічым комплексе Брэсцкай вобласці, якую ён наведаў, ёсць як пэўныя поспехі, так і шэраг праблемных момантаў. «Вельмі шмат неарганізаванасці, якая заключаецца ў тым, што работа выканкамаў (як раённых, гарадскіх, так і аблвыканкама) будуецца па прынцыпе «пачынай, будуй, а грошы потым знойдуцца», — канстатаваў прэм'ер. У выніку гэтага фарміруецца неарганізаваны падыход, будаўнікі вымушаны спыняць будаўніцтва, зацягваюцца тэрміны, што не можа не паўплываць на якасць аб'ектаў, якія будуюцца.

У сувязі з гэтым удзельнікі семінара разгледзяць таксама пытанні, якія датычацца працэсу падрыхтоўкі праектна-каштарыснай дакументацыі, фінансавання. Акрамя таго, паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, наспела неабходнасць выпрацоўкі новых падыходаў да работы будаўнічай галіны. Ён лічыць, што тут патрэбны інавацыйны падыход.

## КЛЮЧ АД ШЧАСЦЯ



**Пра што можа марыць вялікая сям'я, у якой гадуецца шмат прыёмных дзяцей? Найперш пра вялікі дом.**

Жыхарка Чачэрска Галіна Родзіч яшчэ не пазбавілася колішніх адчуванняў, калі цэлых 17 гадоў марыла пра ўласны дом, у якім будзе хапаць месца і сваім шасцярым, і шаснаццаці прыёмным дзецям. Цяпер не ўтойвае радасці, што яе запаветная мара збылася: зусім нядаўна для дзіцячага дома сямейнага тыпу, гаспадыняй якога з'яўляецца Галіна Родзіч, быў пабудаваны двухпавярховы катэдж. Як не радавацца, калі ў доме 11 пакояў, газавае ацяпленне, ванны і душавы пакоі, вялікая кухня? Агульная плошча складае 320 квадратных метраў. У пакоях — прыгожая мэбля. Ёсць пакой з тэнісным сталом, арэлямі і спартыўнымі снарадамі. На кухні — сучаснае абсталяванне. У параўнанні з кватэрай, у якой раней жылі Родзічы (мне і маім калегам-звяздоўцам даводзілася ў ёй неаднойчы бываць), гэтыя апартаменты — сапраўдны палац. Побач на ўчастку ўзведзены і гаспадарчыя пабудовы.

Праект здзейснены пры фінансавай падтрымцы Беларусбанка. Яго кошт складае 3 мільярды 200 мільёнаў рублёў. Галіна Аляксееўна і яе муж Васіль Мікалаевіч з удзячнасцю кажуць пра клопат мясцовай улады і асабліва старшыні райвыканкама Віктара Дарашэвіча. А таксама ўдзячны яны і Гомельскаму абласному аддзяленню Беларускага фонду міру, і нямецкай дабрачыннай арганізацыі: з іх дапамогай набыты мэбля, абсталяванне, гульнявы і спартыўны інвентар, бялізна.

Першае прыёмнае дзіця з'явілася ў сям'і Родзічаў яшчэ ў 1996 годзе. Пазней штогод Галіна Аляксееўна брала пад апеку ўсё новых і новых дзетак, у якіх родныя бацькі былі пазбаўлены правоў. Дарэчы, на Гомельшчыне гэта быў другі, пасля рэчыцкага, дзіцячы дом сямейнага тыпу. Калі адны дзеці выраслі, Родзічы бралі новых, пераважна зусім маленькіх, імкнуліся, каб дзеці былі з адной біялагічнай сям'і. Цяпер большасць выхаваных Родзічамі дзяцей — дарослыя, маюць свае сем'і, гадуюць дзяцей. Але яны сваіх прыёмных бацькоў не забываюць і называюць іх не інакш як мама і тата. Пра што яшчэ можна марыць? І ўсё ж...

— Адзіная ў мяне цяпер мара, каб стол на кухні быў вялікі-вялікі — для ўсіх нашых дзяцей, — усміхаецца Галіна Аляксееўна.

Няцяжка падлічыць усіх Родзічаў: бацькоў — 2, дзяцей — 22, унукаў — 7, нявестак і зяцёў — за тры дзясяткі пераваліць... У новым доме такі стол якраз і будзе дзе паставіць.

**На фотаздымку:** *першае чаяпіцце (праўда не ў поўным сямейным складзе) у новым доме. Трохгадовая Ксенія дэманструе ключ, які стаў сімвалам здзяйснення дзяржаваю важнага сацыяльнага праекта. Чым не ключ для шчасця?*

**Анатоль КЛЯШЧУК. Фота аўтара.**

*г. Чачэрск.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Жанна РАМАНОВІЧ, старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама:**

***«У сталіцы актыўна развіваецца сфера сацабслугоўвання грамадзян, якія маюць у гэтым патрэбу: адзінокіх людзей пажылога ўзросту, інвалідаў, а таксама шматдзетных, няпоўных сем'яў. Сёлета на сацыяльную абарону ў Мінску будзе накіравана больш за 900 млрд рублёў. Гэтыя сродкі прызначаны для выплаты дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі, рэалізацыі сацыяльных праграм па развіцці сацабслугоўвання, паляпшэнні ўмоў і аховы працы, садзейнічання занятасці насельніцтва, фарміравання камфортнага асяроддзя для жыццядзейнасці інвалідаў і іншых фізічна аслабленых асоб, дэмаграфічнай бяспекі. Сродкі будуць накіраваны таксама на ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 11.01.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 9540,00 | ■ |
| Еўра | 12980,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 287,50 | ■ |
| Укр. грыўня | 1153,57 | ▼ |

■ Мацярынства

## НА ЭКА ПАЧНУЦЬ ВЫДАВАЦЬ ІЛЬГОТНЫ КРЭДЫТ

**З першых дзён года ўступіў у сілу Указ Прэзідэнта Беларусі ад 27 снежня 2013 года №574 «Аб прадастаўленні грамадзянам Рэспублікі Беларусь крэдытаў на льготных умовах для аплаты экстракарпаральнага апладнення», паведамілі рэдакцыі ў прэс-службе Беларусбанка.**

Права на атрыманне льготнага крэдыту маюць жанчыны, якія з'яўляюцца грамадзянкамі нашай краіны і якім аказваецца такая медыцынская дапамога па лініі ЭКА. Крэдыт даецца Беларусбанкам у беларускіх рублях, тэрмінам да 5 гадоў, з выплатай працэнтаў за карыстанне ім у памеры 50 працэнтаў стаўкі рэфінансавання Нацыянальнага банка (на 8 студзеня — 11,75% гадавых) шляхам пералічэння грашовых сродкаў на бягучыя (разліковыя) рахункі арганізацый аховы здароўя.

Максімальная сума льготнага крэдыту не павінна перавышаць 300 базавых велічынь, устаноўленых на дату заключэння крэдытнага дагавора. На перыяд атрымання самой жанчынай або яе мужам дапамогі па доглядзе дзіцяці ва ўзросце да трох гадоў, які нарадзіўся з ужываннем ЭКА, грамадзяне маюць права атрымаць адтэрміноўку ў пагашэнні запазычанасці па льготным крэдыце, уключаючы працэнты за карыстанне ім.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Жыллё

## ДОЛЕВАЕ БУДАЎНІЦТВА ПАД ПІЛЬНЫМ КАНТРОЛЕМ

**У нашай краіне падрыхтаваны поўны цыкл нарматыўнага рэгулявання долевага будаўніцтва з улікам практыкі яго рэалізацыі, паведаміла начальнік аддзела рэгулявання жыллёвай палітыкі Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва Беларусі Таццяна ЗАТУРЭНСКАЯ.**

Па гэтай лініі будаўніцтва прынята дастаткова дакументаў, якія накіраваны на абарону правоў дольшчыкаў і прадугледжваюць рэгламентацыю абавязкаў забудоўшчыкаў. У першую чаргу трэба адзначыць указ №263, якім зацверджаны новыя правілы долевага будаўніцтва аб'ектаў для ўсіх забудоўшчыкаў, падрадчыкаў, мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў. Для ўдакладнення пэўных нормаў указа прыняты пастановы Савета Міністраў №1006 і №1007. Тут вызначаецца адзіны парадак супастаўлення кошту будаўніцтва жылля і ўнесеных дольшчыкамі плацяжоў, устаноўлены патрабаванні па фінансавай устойлівасці забудоўшчыкаў.

Таццяна Затурэнская паведаміла, што ў Беларусі ўжо цяпер дзейнічае палажэнне аб долевым будаўніцтве, дзе зацверджана форма тыпавога дагавора, абавязковая да ўжывання, калі будаўніцтва ажыццяўляецца з дзяржпадтрымкай і калі забудоўшчык мае абмежаваны прыбытак. Упершыню прадугледжаны абавязак забудоўшчыка накіроўваць частку свайго прыбытку падрадчыку пасля завяршэння будаўніцтва аб'ектаў на камерцыйнай аснове і правядзення з усімі бакамі ўзаемаразлікаў. Такая мера дасць магчымасць у большай ступені зацікавіць падрадчыка ў хуткім і якасным выкананні работ па дагаворы падраду. Істотна ўзмоцнена адказнасць забудоўшчыка пры зрыве тэрмінаў уводу аб'ектаў у эксплуатацыю. СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### СНОЎДЭН СКРАЎ У АНБ 1,7 МІЛЬЁНА САКРЭТНЫХ ФАЙЛАЎ



У распараджэнні былога супрацоўніка амерыканскіх спецслужбаў Эдварда Сноўдэна апынулася каля 1,7 мільёна файлаў, якія маюць дачыненне да разведвальных аперацый узброеных сіл ЗША.

Такія звесткі сакрэтнага даклада Пентагона. Большая частка файлаў мае дачыненне да бягучых аперацый амерыканскай арміі, ваенна-марскіх і ваенна-паветраных сіл ЗША. Публікацыя шэрагу дакументаў нанесла сур'ёзны ўрон разведвальнай дзейнасці ЗША.

Як вядома, ЗША настойваюць на вяртанні свайго грамадзяніна на радзіму, дзе ён павінен будзе па законе адказаць за крадзеж і выдаванне сакрэтных звестак. У залежнасці ад таго, якое абвінавачанне яму могуць прад'явіць, Сноўдэну можа пагражаць пакаранне аж да пажыццёвага пазбаўлення волі, а тое і смяротнае пакаранне.

### АД УДАРУ МАЛАНКІ ЗАГІНУЛІ ТРЫ ЧАЛАВЕКІ І ПАЦЯРПЕЛІ 22

У Аргенціне ў курортным горадзе Вілья-Хесэль 3 чалавекі загінулі і яшчэ 22 атрымалі раненні ў выніку ўдару маланкі на адным з пляжаў. Падчас навальніцы маланка нечакана ўдарыла па адным з тэнтаў, пад якім ад дажджу хаваліся адпачывальнікі. Тры чалавекі (ва ўзросце 17, 19 і 21 года) памерлі на месцы, дзве жанчыны знаходзяцца ў цяжкім стане. Вілья-Хесэль — адзін з курортных гарадкоў на атлантычным узбярэжжы каля аргенцінскай сталіцы.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 14004>

## ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### НАРВЕЖСКІЯ АЛЕНІ АТРЫМАЮЦЬ НА РОГІ СВЯТЛОАДБІВАЛЬНІКІ

Улады Нарвегіі вырашылі прымацаваць да рагоў мясцовых аленяў адмысловыя святлоадбівальныя манжэты, каб жывёлы сталі больш прыкметнымі на дарогах: такім чынам адміністрацыя дарог агульнага карыстання Нарвегіі спадзяецца знізіць колькасць аварый з удзелам капытных.

Манжэты зроблены з кукурузнай сыравіны, яны распадуцца на элементы, і таму бяспечныя для саміх жывёл і навакольнага асяроддзя. Пазначанымі будуць каля дзесяці тысяч аленяў, усяго ж у Нарвегіі налічваецца іх каля 200 тысяч. Пазначыць не ўсіх было вырашана таму, што гэтыя капытныя, як і многія іншыя іх суродзічы, жывуць у статку, таму ў групе досыць вылучыць усяго пару асобін, каб тыя сталі прыкметнымі. Раней на аленяў спрабавалі мацаваць святлоадбівальны скотч, але клей, які выкарыстоўваўся для яго, станавіўся неэфектыўным на холадзе. Затым іх спрабавалі апырскваць святлоадбівальным спрэем, але ён зніжаў якасць аленевых шкур і тыя грэлі жывёл горш.



## КОРАТКА

Беларусы ў 2013 годзе прадалі валюты на \$8 млрд 295,9 млн у эквіваленце, а купілі на \$10 млрд 675,9 млн. Чыстая купля замежнай валюты за 2013 год склала \$2 млрд 380 млн.

Прыкладна 1,5 тыс. работнікаў гандлю павінны вывучыць замежныя мовы да ЧС-2014. Таксама падчас чэмпіянату будзе рэалізавана тэхналогія арганізацыі грамадскага харчавання, арыентаваная на хуткае абслугоўванне праз буфеты, бары, рэстараны.

Агенцтва тэленавін Белтэлерадыёкампаніі рыхтуе цыкл дакументальных фільмаў пра беларускую шляхту. Цыкл стане працягам такіх альтэрнатыўных расследаванняў і адкрыццяў, як праекты «Радзівілы. Тайны сям'і» і «Слуцкія паясы. Тайныя знакі».

■ Пакланіцца святыні

## ДАРЫ ЛЮДЗЕЙ БОГУ ВЯРТАЮЦЦА ДА ЛЮДЗЕЙ

**Праз тыдзень у Мінск прыбудзе адна з найвялікшых святыняў хрысціянскага свету — Дары валхвоў**

Так, менавіта тыя самыя Дары, якія, згодна з Біблейскім паданнем, прынеслі немаўляці Ісусу з усходу, ідучы на святло Віфлеемскай зоркі, што абвяшчала аб нараджэнні Збавіцеля.

Евангельскія тэксты сведчаць, што валхвы ішлі на пошук нованароджанага Месіі па загадзе цара Ірада, які нібыта жадаў пакланіцца боскаму дзіцяці, а на самой справе хацеў знішчыць яго, бо было яму прадказана разам з нараджэннем гэтага дзіцяці заняпад яго царства. Валхвы выканалі загад цара — знайшлі той хлеў, дзе ў яслях нарадзіўся Хрыстос. Але, як сведчыць Біблія, убачыўшы Ісуса, «паўшы, пакланіліся Яму і, адкрыўшы скарбы свае, прынеслі Яму дары: золата, ладан і смірну». Кожны з гэтых дароў, як тлумачыць сёння Царква, меў сімвалічнае значэнне. Золата было прынесена Ісусу як Цару Іўдзейскаму, ладан (араматычная смала ўсходняга дрэва) — як Богу, смірна (таксама араматычнае рэчыва) — як чалавеку, якога чакаюць мукі і пахаванне. У Свяшчэнным Пісанні не сказана, колькі было валхвоў, але прынята лічыць, што іх было трое — па колькасці дароў. У адной з багаслоўскіх прац VIII стагоддзя названы іх імёны — Каспар, Мельхіёр і Валтасар. У іншых апавяданнях нават апісваецца іх знешнасць: Каспар — «безбароды юнак», Валтасар — «барадаты старац», а Мельхіёр — «цемнаскуры», родам з Эфіопіі. Назад да Ірада валхвы не вярнуліся: яны «атрымалі ў сне адкрыццё» і, абмінуўшы Ерусалім, вярнуліся ў свае землі. Пасля яны сталі хрысціянамі і прапаведнікамі. Сёння залатыя каўчэжац з іх мошчамі знаходзіцца ў Кёльнскім саборы.

Пагадзіцеся, дзіўным і амаль нерэальным здаецца тое, што Дары валхвоў — сведкі больш чым 2000-гадовай гісторыі — дажылі да нашых дзён. Але іх «летапіс», які захаваўся ў пісьмовых крыніцах, настолькі падрабязны, што не пакідае ніякіх сумненняў.

Згодна з царкоўным паданнем, Дары Божая Маці захоўвала ўсё жыццё. А пасля незадоўга да свайго Успення разам з поясам і рызай, якія належалі ёй, перадала Іерусалімскай царкве, дзе яны і захоўваліся да 400 года. Пры імператары Аркадзіі іх перанеслі ў Канстанцінопаль. Але ў 1453 годзе султан Мехмед II асадзіў і захапіў сталіцу праваслаўнай веры. Выратаваць многія хрысціянскія святыні ад знішчэння мусульманамі змагла... маці султана — былая сербская прынцэса Марыя Бранкавіч. Каб аблегчыць сваё існаванне пад асманскім ігам, сербскі правіцель Георгій аддаў яе замуж за султана Мурада. Яна здолела не толькі захаваць сваю праваслаўную веру, але і мела вялікі ўплыў на сына, які дазволіў ёй зберагчы многія хрысціянскія святыні і ўзяць пад асабістую апеку і абарону Святую гару Афон.



СТАР. 2

■ Курсавая розніца

# Палітыка Нацбанка будзе жорсткай

**Новы год усе ўжо адсвяткавалі. Жадалі адно аднаму ўсяго, што толькі магчыма, новага. Аднак ёсць такія непахісныя, кансерватыўныя рэчы, якія застаюцца старымі амаль заўсёды. Напрыклад, грошы. Так адбылося і на гэты раз. А разам з грашыма засталіся і ўсе ранейшыя эканамічныя праблемы носьбітаў сусветных валют.**

Пасля соннага і лянотнага часу свят на валютны рынак вярнуліся гучныя баталіі. І нават не столькі за «рознакаляровыя паперкі», колькі за думкі. Пачатак года заўсёды багаты на прадказанні. Дык вось цяпер эксперты сцвярджаюць, што год будзе вельмі неспрыяльным для долара. Прычына таму — жорсткасць пазіцыі Еўрасаюза і пэўная «мяккацеласць» Злучаных Штатаў. Прагназуецца, што амерыканская валюта будзе слабець (а еўра, адпаведна, мацнець) на фоне зніжэння аб'ёму рэзерваў цэнтральных банкаў у доларах і павелічэння долі еўра. Акрамя таго, большую даходнасць цяпер даюць рынкі, якія развіваюцца. І некаторыя кажуць, што можа адбыццаператок капіталу, напрыклад, у Індыю. Так гэта будзе ці не, сказаць цяжка. Але еўра і сапраўды адчувае сябе пакуль што лепш. Увогуле, еўрапейская эканоміка падобна да канцлера Германіі Ангелы Меркель. Нядаўна яна атрымала сур'ёзную траўму, катаючыся на лыжах, але гэта нязначна паўплывала на яе працу — таксама і еўра нават у цяжкія часы трымаўся годна.

Што ж да нашай краіны, то Нацыянальны банк у 2014 годзе таксама не збіраецца змякчаць грашова-крэдытную палітыку на фоне дасягнутых дамоўленасцяў па прыцягненні неабходных аб'ёмаў знешніх запазычанняў для папаўнення дзяржаўных золатавалютных рэзерваў. У галоўным банку сцвярджаюць, што рэалізацыя захадаў па павышэнні эфектыўнасці банкаўскага крэдытавання дазволіць сёлета ў І квартале абмежаваць прырост патрабаванняў да эканомікі на ўзроўні да 0,7 працэнта ў сярэднім за месяц. «Такія тэмпы крэдытавання адпавядаюць гадавому прагнозу, дазваляюць забяспечваць неабходнае развіццё эканомікі без негатыўнага ўплыву на макраэканамічную збалансаванасць, — паведамляе ўпраўленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка. — Падыходы да рэфінансавання банкаў таксама зробяцца больш жорсткімі, стымулюючы банкі забяспечваць правядзенне актыўных аперацый строга ў адпаведнасці з наяўнымі рэсурснымі магчымасцямі. Стаўка рэфінансавання ў студзені захаваецца на ранейшым узроўні, а ў далейшым яе змены будуць ажыццяўляцца ў залежнасці ад дынамікі інфляцыі і сітуацыі на фінансавым рынку і мець плаўны характар». Аднак пры гэтым базавым прынцыпам працэнтнай палітыкі сёлета застанецца «падтрыманне даходнасці па рублёвых інструментах, якая перавышае даходнасць захоўвання сродкаў у замежнай валюце і забяспечвае надзейную абарону зберажэнняў ад інфляцыі». Гэта можа пасадзейнічаць умацаванню даверу да нацыянальнай валюты і дэдаларызацыі эканомікі.

Адносна курсаў валют Нацбанк збіраецца прадоўжыць правядзенне палітыкі, якая забяспечвае фарміраванне абменнага курсу беларускага рубля на аснове попыту і прапановы. «Пры гэтым Нацыянальны банк не дапусціць рэзкіх ваганняў курсу, згладжваючы іх сваімі інструментамі».

Пакуль жа еўра зноў здаў пазіцыі адносна беларускага рубля — патаннеў на 20 рублёў (мінус 0,1%) да 12980. Долар, у сваю чаргу, падняўся трошкі яшчэ — на 20 рублёў (плюс 0,2%) да 9540. Наш сусед расійскі рубель таксама знізіўся — на 2,5 грашовай адзінкі (мінус 0,9%) да 287,5.

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ Падрабязнасці

# АНЕСТЭЗІЁЛАГ «ЭКАМЕДЦЭНТРА» ПАСЛЯ НЯЎДАЛАЙ АПЕРАЦЫІ ПАЕХАЎ У МАСКВУ

**Пластычную аперацыю пацыентцы медыцынскага цэнтра «Экамедсэрвіс» Юліі Кубаравай праводзілі на загадзя няспраўным абсталяванні. Аб гэтым у судзе Кастрычніцкага раёна Мінска паведаміў дзяржаўны абвінаваўца.**

Па словах дзяржабвінаваўцы, апарат для правядзення анестэзіі і штучнай вентыляцыі лёгкіх меў шматлікія няспраўнасці. Таму не дзіўна, што падчас аперацыі Юліі Кубаравай ён даў збой. Урач-анестэзіёлаг спрабаваў выправіць сітуацыю: выключыў апарат і потым зноў уключыў. Аднак той зноў выдаваў тэхнічную памылку... У гэты час у пацыенткі адбылося кароткачасовае спыненне сэрца, таму спецыялісты часова спынілі аперацыю. Перавялі дзяўчыну на ручную вентыляцыю лёгкіх і ўвялі неабходныя медыцынскія прэпараты. Калі стан пацыенткі палепшыўся, аперацыю працягнулі.

Пасля аперацыі стан дзяўчыны пагоршыўся. Яе адвезлі ў 4-ю гарадскую клінічную бальніцу. Там лячэнне, па словах дзяржабвінаваўцы, праводзілася правільна, аднак гэта не дапамагло пазбегнуць фатальнага зыходу.

Анестэзіёлаг жа, паводле слоў пракурора, замест таго, каб кантраляваць стан пацыенткі, адразу пасля аперацыі, якая прайшла з ускладненнямі, паехаў на некалькі дзён у Маскву. Праводзіў там іншую аперацыю...

Цяпер ён знаходзіцца на лаве падсудных і прызнае сваю віну ў смерці Юліі Кубаравай, але часткова. Урач не адмаўляе таго, што не ў поўнай меры кантраляваў стан сваёй пацыенткі пасля аперацыі. Ён таксама пацвердзіў, што неадкладна не паведаміў кіраўніцтву аб ускладненнях, якія адбыліся. Разам з тым, абвінавачаны сцвярджае, што не ведаў аб тэхнічных няспраўнасцях дыхальнага апарата. Маўляў, да аперацыі Юліі Кубаравай ніякіх заўваг да гэтага абсталявання не было ні ў яго, ні ў іншых супрацоўнікаў медцэнтра. Тым не менш, паводле слоў дзяржабвінаваўцы, апарат быў далёка не новы: эксплуатаваўся з 2007 года і прафесійна не абслугоўваўся.

Дарэчы, суд задаволіў іскавае патрабаванне бацькоў памерлай дзяўчыны аб кампенсацыі маральнай і матэрыяльнай шкоды. І пастанавіў накласці арышт на маёмасць «Экамедсэрвіса» на суму больш за 10 млрд рублёў.

**Надзея ПАЎЛАВА**

■

# НЕФАРМАЛЬНЫ ПАДЫХОД

**У Магілёве адбыўся семінар ідэалагічных работнікаў вобласці з удзелам першага намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Аляксандра РАДЗЬКОВА.**



Фота БЕЛТА.

Галоўнай тэмай мерапрыемства, якое сабрала больш за 160 чалавек, стала абмеркаванне актуальных пытанняў ідэалагічнай работы ў сучасных умовах.

— Ідэалогія неаддзельная ад эканамічнага або сацыяльнага жыцця, — адзначыў **намеснік старшыні аблвыканкама Валерый МАЛАШКА**. — Але, якія б задачы мы ні ставілі, якіх бы паказчыкаў ні спрабавалі дасягнуць, без акцэнтавання ўвагі на розныя сацыяльныя групы, канкрэтнага чалавека не абысціся. Пры гэтым асноўнымі крытэрыямі адзнакі работы былі і застаюцца апярэджанне падзей, фарміраванне грамадскай думкі.

У вобласці існуе інстытут рэгіянальных сацыяльна-палітычных даследаванняў, які дазваляе назапашваць навуковы вопыт, сацыяльную інфармацыю аб жыцці рэгіёна на працягу многіх гадоў. Гэта дае магчымасць не толькі валодаць сённяшняй сітуацыяй, але і прагназаваць будучыню.

— Вывучэнне настрою людзей перад сацыяльна значнымі кампаніямі дазваляе выпраўляць становішча на праблемных участках, — падкрэсліў Валерый Малашка. — Абавязковай умовай для прафесійнага росту ідэалагічных кадраў з'яўляецца інавацыйны падыход да арганізацыі навучання. Па ініцыятыве ўпраўлення ідэалагічнай работы вобласці распрацавана індывідуальная схема навучання на 13 інавацыйных пляцоўках раёнаў і гарадоў. За час іх існавання падрыхтоўку прайшло каля 600 работнікаў. Задача сучаснага кіраўніка — даць магчымасць работніку працаваць якасна, суадносна са сваімі здольнасцямі. На Магілёўшчыне ёсць прадпрыемствы, якія створаны прыватным бізнесам і кіруюцца эканамічна адукаванымі людзьмі. Яны адпавядаюць тым якасцям, якія патрабуе час і кіраўніцтва дзяржавы, — гэта хуткасць, гнуткасць і творчасць.

— У сваёй рабоце мы стараемся пазбягаць фармальнасці і фальшу, — падзялілася **начальнік упраўлення ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Магілёўскага гарвыканкама Ала ГАЛУШКА**. — Рэагуем на змяненні ў заканадаўстве, праводзім навучальныя семінары, працуем у цеснай звязцы з грамадскімі аб'яднаннямі.

Вопытам прыцягнення дзяцей да стварэння праграмных прадуктаў падзялілася завуч магілёўскай школы № 34 Галіна Бяляева. На базе гэтай школы працуе рэспубліканская інавацыйная пляцоўка па распрацоўцы інфармацыйных сродкаў навучання. З дапамогай навучэнцаў тут ствараюцца электронныя рэсурсы па гісторыі Магілёва, а віртуальны музей баявой славы, які знаходзіцца на сайце школы, наведваюць ад 500 да 1000 чалавек у дзень.

Тое, што ідэалогія і гісторыя — гэта адно цэлае, нагадаў дырэктар музея гісторыі Магілёва Аляксей Бацюкоў. Дарэчы, адзіны ў краіне Статут ВКЛ на беларускай мове захоўваецца ў фондах гэтай установы. Яго дапамаглі выкупіць у прыватнай асобы жыхары горада.

Удзельнікі семінара пабывалі на вядучых прадпрыемствах Магілёва (холдынгу «Група Кампаній Протас» і на навукова-вытворчым прадпрыемстве «Тэхналіт») ацанілі развіццё прыдарожнага сэрвісу і аграэкатурызму на тэрыторыі Магілёўскага раёна, азнаёміліся з вопытам работы інфармацыйнага агенцтва «Магілёўскія ведамасці». Яны таксама ўсклалі кветкі да Вечнага агню на Савецкай плошчы ў Магілёве і наведалі мемарыяльную капліцу ў памяць аб Айчыннай вайне 1812 года ў вёсцы Салтанаўка.

На пленарным пасяджэнні разглядалася арганізацыя ідэалагічнай работы з насельніцтвам на прыкладзе Кастрычніцкага раёна горада Магілёва, вопыт супрацоўніцтва прафсаюзнай арганізацыі студэнтаў універсітэта і грамадскай арганізацыі «Белая Русь».

— Трэба быць кампетэнтным ва ўсіх сферах і пытаннях, — адзначаў падчас размовы з журналістамі Аляксандр Радзькоў. — Трэба, каб ідэолаг быў перакананы ў тым, з чым ён ідзе да людзей, як развіваецца грамадства, эканоміка, турызм, сацыяльная сфера, каб ён гэта непасрэдна адчуваў і нават удзельнічаў у гэтым. Гэты год — гасціннасці, і вобласці ёсць што паказваць. Але трэба падумаць, як гэта ўсё падаць. Трэба хварэць душой за тое, чым займаешся. Як тая настаўніца з 34-й школы, якая распавядала сёння пра абарону Магілёва. Калі ідэолаг разумее, чым дыхае вытворчасць, як развіваецца тая ці іншая сфера, ён зможа пераканаць і іншых.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

■ Пытанне — адказ

# ЯК ТРАПІЦЬ У АДДЗЯЛЕННЕ ПАВЫШАНАЙ КАМФОРТНАСЦІ ДОМА-ІНТЭРНАТА

**Я працую ў Маскве. Дома застаўся старэнькі бацька, прыглядваць за ім цяпер няма каму. Чула, што ў некаторых дамах-інтэрнатах створаны аддзяленні павышанай камфортнасці для пажылых людзей. Куды трэба звярнуцца, каб размясціць там майго бацьку?**

**Якімовіч М.С.,** *Мінская вобл.*

Як нам паведаміў **намеснік начальніка ўпраўлення стацыянарных устаноў сацыяльнага абслугоўвання і капітальнага будаўніцтва Мінпрацы і сацыяльнай абароны Беларусі Мікалай АРОЛ,** сёння аддзяленні павышанай камфортнасці створаны ў 6 дамах-інтэрнатах рэспублікі. У іх пражывае 127 чалавек. У такіх аддзяленнях сацыяльныя паслугі прадастаўляюцца на платнай аснове, пастаянна або часова. Тут ствараюцца палепшаныя ўмовы пражывання, забяспечваецца догляд на сучасным узроўні, у тым ліку па індывідуальнай праграме, з улікам патрэб кожнага чалавека.

Вось пералік устаноў з такімі аддзяленнямі:

— Рэспубліканскі інтэрнат ветэранаў вайны і працы ў пасёлку Ждановічы Мінскага раёна;

— Мінскі гарадскі дом-інтэрнат для ветэранаў вайны і працы «Світанак»;

— Старадарожскі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў у Мінскай вобласці;

— Дом-інтэрнат для ветэранаў вайны, працы і інвалідаў «Васільеўка» ў Гомельскай вобласці;

— Гродзенскі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў;

— Жухавіцкі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў у Гродзенскай вобласці.

Акрамя таго, у першым паўгоддзі 2014 года плануецца адкрыццё такога аддзялення ў Віцебскім доме-інтэрнаце для састарэлых і інвалідаў.

Па пытаннях размяшчэння бацькі ў аддзяленне павышанай камфортнасці трэба звяртацца ва ўпраўленне па працы, занятасці і сацыяльнай абароне свайго рэгіёна.

❒❒❒

Неабходна таксама адзначыць, што Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі зацікаўлена ў пашырэнні сеткі такіх інтэрнатаў. У прыватнасці, **міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА** ў канцы мінулага года заявіла: «Калі раней мы казалі толькі пра тое, што органы сацыяльнай абароны павінны канцэнтравацца на аказанні дапамогі адзінокім людзям, то сёння іх мэтавая аўдыторыя пашыраецца за кошт тых людзей, чые дзеці працуюць за межамі Беларусі. Таму мы зацікаўлены ў тым, каб бізнес заняў гэтую нішу. Мы можам стварыць высокакамфартабельныя пансіянаты, але гэта павінен зрабіць бізнес. І знойдуцца людзі, якія заплацяць добрыя грошы для таго, каб размясціць сваіх бацькоў у гэтых пансіянатах».

**Усяго ў 79 стацыянарных установах сацыяльнага абслугоўвання зараз пражываюць 18,2 тысячы чалавек, якія маюць патрэбу ў пастаянным доглядзе з-за сталага ўзросту, праблем са здароўем, у тым ліку тыя, хто пакутуе на псіхічныя захворванні.**

**Святлана БУСЬКО**

■

# ДАРЫ ЛЮДЗЕЙ БОГУ ВЯРТАЮЦЦА ДА ЛЮДЗЕЙ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Менавіта туды ў 1470 годзе Марыя вырашыла пераправіць выратаваныя святыні, у тым ліку і Дары валхвоў. Паплыла яна туды сама, нягледзячы на забарону з'яўляцца на Афоне жанчынам. Але, калі сышла з карабля, голас з нябёсаў спыніў яе: маўляў, тут пачынаецца іншае царства — Багародзіцы. Султанша ўпала на калені і стала прасіць прабачэння, а з манастыра святога Паўла выйшаў ігумен з браціяй і прыняў у яе святыні. З таго часу Дары валхвоў знаходзяцца на Святой гары ў манастыры, а на месцы, дзе малілася Марыя Бранкавіч, стаіць крыж, што завецца Царыцыным...




Дары, якія захаваліся да сённяшняга дня — гэта 28 невялікіх залатых пласцін-падвесак у форме трапецый, чатырохвугольнікаў і многавугольнікаў, упрыгожаным адмысловым арнаментам. Малюнак ні на адной з пласцінак не паўтараецца. Ладан і смірна, прынесеныя валхвамі асобна, калісьці былі сплаўлены ў невялікія, з масліну, шарыкі цёмнага колеру — іх захавалася каля 70. З іх зробленыя пацеры на сярэбраных нітках, што мацуюцца да залатых пласцін. Захоўваюцца Дары ў дзесяці спецыяльных каўчэгах.

Адзін з гэтых каўчэгаў з трыма пласцінамі ўпершыню за больш чым пяцьсот гадоў пакінуў гару Афон. На спецыяльным самалёце, у суправаджэнні дэлегацыі манахаў на чале з настаяцелем манастыра святога Паўла архімандрытам Парфеніем ён быў дастаўлены ў Маскву, у храм Хрыста Збавіцеля. Зараз да яго стаяць тысячы паломнікаў — людзі цярпліва чакаюць у чарзе каля дзесяці гадзін. 14 студзеня Дары прыбудуць у Санкт-Пецярбург, а 18-га, перад святам Хрышчэння Гасподняга, іх прывязуць у Мінск. Святыня будзе знаходзіцца ў Доме Міласэрнасці па 24 студзеня, а затым накіруецца на пяць дзён у Кіева-Пячэрскую лаўру і вернецца на Афон.

Паглядзець на яе, дакрануцца да яе сапраўды варта. Каб вылечыцца ад душэўнай і фізічнай немачы: ёсць шматлікія сведчанні аб дзівосных пазбаўленнях ад розных хвароб. Каб спрычыніцца да жывой Гісторыі, якой ужо больш за дзве тысячы гадоў, і да Дзіва: манахі кажуць, што Дары распаўсюджваюць дзівосны водар, а некаторыя вернікі сведчаць, што чуюць ад пласцінак незямны звон, які расказвае аб таямніцы Нараджэння Збавіцеля. Каб проста быць удзельнікам і сведкам таго, што адбываецца ўпершыню за паўтысячы гадоў. Адбываецца на нашай зямлі і для нас.

**Эмілія ШЭЛЕСТ.**

# ДЗЕСЯЦЬ ДЗЁН СТУДЗЕНЯ: САМАЕ ЦІКАВАЕ Ў ГЕАПАЛІТЫЦЫ



**З цікавых геапалітычных навін студзеня можна назваць зробленае Джымам О'Нілам, аналітыкам банка Goldman Sachs, прадказанне, што ў бліжэйшы час можна чакаць з'яўлення новага інтэграцыйнага ўтварэння — «МІНТ».**

Гэты аналітык вядомы тым, што ў свой час прыдумаў абрэвіятуру БРІК (па першых літарах такіх краін, як Бразілія, Расія, Індыя і Кітай) і прадказаў гэтым дзяржавам перспектывы засланіць сабой Захад па сукупнай эканамічнай магутнасці праз некалькі дзесяцігоддзяў. Цікава, што праз некалькі гадоў пасля гэтага прадказання кіраўнікі вышэйзгаданых дзяржаў сапраўды стварылі сумесны блок, а пасля да іх далучылася і Паўднёвая Афрыка, у сувязі з чым назва блока змянілася на БРІКС.

Якія ж краіны ўвойдуць у новы блок пад назвай «МІНТ», на думку Джыма О'Ніла? Гэта Мексіка, Інданезія, Нігерыя і Турцыя, насельніцтва якіх, разам узятае, дасягнула планкі ў 616 мільёнаў чалавек і будзе працягваць імкліва павялічвацца ў бліжэйшыя гады. Калі прагноз аналітыка спраўдзіцца, у БРІКС з'явіцца новы магутны саюзнік, які зробіць завяданне магутнасці заходняга свету на глабальнай арэне яшчэ больш хуткім.

**Кітай выйшаў на першае месца ў свеце па аб'ёме свайго знешняга гандлю,** які дасягнуў па выніках 2013 года вялізнай лічбы ў 4,16 трыльёна долараў. Пры гэтым тэмпы росту гэтага паказчыка перавысілі звесткі 2012 года, што сведчыць аб станоўчай дынаміцы росту тавараабароту КНР.

Што азначае гэта падзея з пункту гледжання сусветнай палітыкі? Лідарства Кітая ў імпарце і экспарце на глабальнай арэне азначае ўсё большы інтарэс да яго з боку як самых уплывовых сусветных экспарцёраў, так і імпарцёраў. Гэтыя бізнес-структуры ўсё больш зацікаўлены ў спрыяльным супрацоўніцтве з Кітаем для ўласнага працвітання. І, натуральна, яны маюць вялізны ўплыў на палітыкаў у сваіх краінах. Таму палітычныя эліты многіх краін свету, якія залежаць ад прыхільнасці да іх прадпрымальніцкай супольнасці ў сваёй палітычнай дзейнасці, вымушаны лічыцца з Кітаем з кожным годам усё ў большай ступені. І гэта, зразумела ж, выкарыстоўваецца ўрадам Кітая для росту магутнасці краіны на сусветнай арэне.

2014 год цікавы для большасці экспертаў па геапалітыцы тым, што адбудзецца з Афганістанам пасля вываду адтуль кааліцыйных сіл, асноўную масу якіх складаюць амерыканскія салдаты. На гэтым фоне **чарговае абвастрэнне адносін Кабула і Вашынгтона** не магло застацца незаўважаным. Прычына гэтага дастаткова дзіўная на фоне імкнення ЗША пазіцыянаваць сябе як вядучую праваабарончую дзяржаву ў свеце.

Праблема ў тым, што ўрад Афганістана вырашыў адпусціць частку з арыштаваных амерыканцамі вязняў, якія ўтрымліваюцца на ваеннай базе Баграм, толькі нядаўна перададзенай амерыканцамі ў распараджэнне ўлад Афганістана. Гэта тлумачыцца тым, што ў дачыненні да іх няма ніякіх доказаў, якія пацвярджалі б іх злачынную дзейнасць. У Вышангтоне ж запэўніваюць, што гэта небяспечныя тэрарысты, і няхай ніякіх цвёрдых доказаў і няма, іх трэба трымаць гадамі пад арыштам або аддаць пад суд. І пагражаюць пагаршэннем адносін ЗША з Афганістанам, калі гэтыя вязні будуць вызвалены. Ці не праўда, цікавая пазіцыя ў дачыненні да абароны правоў чалавека па-амерыканску?

10 студзеня **завяршыўся скандал паміж Індыяй і ЗША**, які пачаўся яшчэ ў снежні па прычыне арышту амерыканскай паліцыяй намесніка кіраўніка генконсульства Індыі Дэвіяні Кхабрагадэ ў Нью-Ёрку. Ёй дазволілі паехаць дамоў у Індыю. Нягледзячы на дыпламатычны імунітэт, амерыканская паліцыя арыштавала 12 снежня 2013 года Дэвіяні Кхабрагадэ на вуліцы і дастаткова пагардліва абыходзілася з ёй, абвінаваціўшы ў махлярстве пры афармленні візы для сваёй хатняй работніцы і пратрымаўшы некалькі гадзін у камеры з наркаманамі.

Абурэнне індыйскага ўрада было такім вялікім, што амерыканцам давялося ў выніку адступаць. Гэтаму садзейнічалі і меры, прынятыя Індыяй: каля пасольства ЗША ў Нью-Дэлі знялі загароду, а ў супрацоўнікаў консульскага аддзела пасольства ЗША і амерыканскіх генеральных консульстваў у Індыі ануляваліі ідэнтыфікацыйныя карткі, без якіх іх далейшае знаходжанне ў краіне аказалася пад пытаннем. З якой мэтай амерыканцы сапсавалі свае дастаткова неблагія да гэтага адносіны з Індыяй, абыходзячыся з дыпламатам такім варварскім чынам, так і засталося загадкай. Магчыма, уся справа ў банальным адчуванні ўсёдазволенасці і беспакаранасці, дамінуючым у некаторых чыноўнікаў ЗША за гады панавання амерыканцаў на сусветнай арэне.

Заканамерны кірунак набылі **падзеі ў Сірыі**: фарміраванні баевікоў, якія ўжо больш за два гады ваююць з законным урадам, перасварыліся паміж сабой і пачалі поўнамаштабныя ваенныя дзеянні. Бітва вядзецца паміж групоўкамі «Ісламскі фронт» і «Ісламская дзяржава Ірака і Леванта». Яшчэ адной сірыйскай сенсацыяй студзеня стала рэзкае змяненне былой пазіцыі Турцыі па сірыйскім пытанні. 9 студзеня ў інтэрв'ю міністра замежных спраў Турцыі Ахмет Давутаглу прагучала, што рэжым Башара Асада можна назваць «меншым злом» у параўнанні з няправільнымі метадамі дзеянняў радыкальных груповак у Сірыі.

**Сяргей КІЗІМА,**
**доктар палітычных навук.**

# ДОЛЕВАЕ БУДАЎНІЦТВА ПАД ПІЛЬНЫМ КАНТРОЛЕМ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Акрамя таго, сёння спецыялістамі падрыхтаваны праект пастановы аб парадку вяртання сродкаў грамадзян пры спыненні будаўніцтва з удзелам дольшчыкаў. Гэта дазволіць удакладніць парадак прымянення індэксаў будаўніча-мантажных работ і шэраг іншых мер, якія дадуць магчымасць стварыць поўны цыкл нарматыўнага рэгулявання долевага будаўніцтва ў Беларусі. Мяркуецца, што вышэйназваны дакумент будзе падпісаны ў бліжэйшы час.

Эксперты міністэрства будуць і надалей ажыццяўляць аналіз функцыянавання прынятых дакументаў, пасля чаго ацэньваць наяўнасць у сферы долевага будаўніцтва іншых праблемных момантаў, якія патрабуюць дадатковай дапрацоўкі.

Кіраўніцтва Мінбудархітэктуры ўпэўнена, што прыняты комплекс мер дасць магчымасць у значнай ступені засцерагчы простых грамадзян, якія ў якасці дольшчыкаў удзельнічаюць у будаўнічым працэсе. Гэта дазволіць адсеяць недастаткова кваліфікаваных і нядобрасумленных забудоўшчыкаў, якім цяпер давядзецца працаваць па новых, выразна вызначаных правілах.

**Сяргей КУРКАЧ.**

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

## АД СЭРЦА — ДА СЭРЦА

**У Маскоўскім раёне Брэста прайшла чарговая калядная акцыя «Ад сэрца — да сэрца з дабрынёй». На вечарыне ў школе №15 уручылі канверты з грашовай дапамогай малазабяспечаным сем'ям. Сродкі сабраў папячыцельскі савет раёна, у склад якога ўваходзяць прадстаўнікі буйных прадпрыемстваў.**

Цікава, што акцыя вырасла з мерапрыемства адной кампаніі — будтрэста № 8. Найбуйнейшая ў вобласці будаўнічая арганізацыя збірала добраахвотныя ахвяраванні ў калектывах сваіх супрацоўнікаў, каб дапамагчы тым, хто асабліва мае патрэбу. Пазней геаграфія добрай справы пашырылася на ўвесь раён. І сёлета папячыцельскі савет сабраў да Каляд рэкордную суму — 100 мільёнаў рублёў. Грошы былі ўручаны бацькам шматдзетных, прыёмных сем'яў, тым, хто выхоўвае дзяцей-інвалідаў. Кіраўнік адміністрацыі Маскоўскага раёна Брэста Аляксандр РАГАЧУК сказаў, што акцыя абавязкова будзе працягвацца.

**Яна СВЕТАВА.**

## «ПАДАРЫ ДЗЕЦЯМ НОВЫ ГОД»

**Пад такой назвай магілёўскія паштавікі правялі дабрачынную акцыю ў Дрыбінскім раёне.**

Падарункі, у склад якіх увайшлі цукеркі, цацкі «зрабі сам» і пісьмо ад Дзеда Мароза, атрымалі выхаванцы Раснянскай дапаможнай школы-інтэрната, дзе жывуць і вучацца дзеці-сіроты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў. Як паведаміла намеснік дырэктара Магілёўскага філіяла РУП «Белпошта» Галіна Марчанка, навагоднія камплекты былі ўручаны дзецям падчас навагодніх свят у гэтай установе.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

## ФЕСТЫВАЛЬ КЛАСІЧНАЙ МУЗЫКІ

**Міжнародны фестываль «Студзеньскія музычныя вечары» праходзіць у Брэсце з 9 па 12 студзеня.**

На свята прыехалі музыканты з 10 краін свету. У дзень адкрыцця на сцэне Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы саліравалі ў асноўным вакалісты. Вечар распачаў Дзяржаўны акадэмічны сімфанічны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Аляксандра Анісімава. Значнай падзеяй фестывалю ўжо названы выступленні народнай артысткі Расіі, салісткі Марыінскага тэатра оперы і балета Ірыны Багачовай, а таксама любіміцы брэсцкай публікі Саламіі Прыймак з Кіеўскага акадэмічнага тэатра аперэты.

Цікава, што сёлета адбылося і неафіцыйнае адкрыццё «Вечароў». 8 студзеня ў Свята-Мікалаеўскім гарнізонным саборы Брэсцкай крэпасці прайшоў канцэрт галандскага хору «Cantatrix». Хор выканаў месу, прысвечаную абаронцам Брэсцкай крэпасці і галандскага горада Кувордэна.

**Яна СВЕТАВА.**

## ПЛАТНЫ ТАЛОНЧЫК — ПА НУМАРЫ 131

**Медыцынская даведачная служба 131 пачала працаваць у тэставым рэжыме ў беларускай сталіцы.**

Даведачная служба ўяўляе сабой call-цэнтр, які працуе на базе адкрытага акцыянернага таварыства «Медыцынская ініцыятыва». Патэлефанаваўшы па нумары 131, можна, напрыклад, заказаць талон на ўсе віды УГД-дыягностыкі ва ўсе ўстановы, што знаходзяцца ў падпарадкаванні Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, атрымаць інфармацыю аб платных медыцынскіх паслугах, якія там аказваюцца насельніцтву, а таксама выклікаць медыцынскае таксі.

Пакуль што даведачная служба працуе ў тэставым рэжыме ў будныя дні з 8.30 да 17.00. Гэты праект мае пакрокавую стратэгію развіцця. У далейшым пералік інфармацыйных паслуг плануецца пашырыць. У яго ўвойдуць кансультацыі па іншых запатрабаваных у насельніцтва пытаннях медыцынскага характару.

Паколькі медыцынская даведачная служба працуе ў тэставым рэжыме, званок на нумар 131 будзе бясплатны. У будучым інфармацыйныя паслугі стануць платнымі, але з улікам сацыяльнай значнасці праекта яны ўсё роўна застануцца даступнымі для насельніцтва.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ДОМРАЧАВА З «СЕРАБРОМ»

**Чацвёртая гонка запар завяршаецца для Дар'і Домрачавай подыумам.**



На этапе Кубка свету ў Рупольдынгу лідар нашай жаночай зборнай даволі ўдала правяла індывідуальную гонку, дапусціўшы на чатырох агнявых рубяжах два промахі. Гэтага выніку хапіла, каб фінішаваць у выніковым пратаколе на другім радку. Пераможцай гонкі стала чэшка Габрыэла Соўкалава, «бронза» на рахунку яшчэ адной чэшскай біятланісткі — Вяронікі Віткавай. Другі нумар беларускай зборнай Надзея Скардзіна фінішавала на сёмай пазіцыі. Па выніках індывідуальнай гонкі правядуць пас'ют, які адбудзецца ў нядзелю.

**Дарына ЗАПОЛЬСКАЯ.**

## ПРАКАЦІ НАС, КІРОЎЦА... У БАГАЖНІКУ!

**Моладзь з Лоеўшчыны вырашыла наведаць абласны цэнтр на аўтамабілі «Toyota». Яго кіроўцу супрацоўнікі ДАІ спынілі каля трох гадзін ночы ў Гомелі на Рэчыцкім праспекце.**

Калі з салона выйшлі 5 чалавек, аўтамабіль меў занадта нізкую пасадку, што прымусіла праваахоўнікаў папрасіць адчыніць багажнік. Адтуль... вылезлі дзве дзяўчыны. Як расказалі ў абласной ДАІ, маладыя людзі, калі збіраліся ў начную паездку, зразумелі, што ўсім ахвотным месца ў салоне не хапае. Не доўга разважаючы, дзвюх прыгажунь пагрузілі ў багажнік... Праваахоўнікі нагадваюць, што ў багажны адсек трапляюць выхлапныя газы, а прытоку свежага паветра няма, таму дзяўчатам пашчасціла, што яны не атруціліся. У выніку кіроўца быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за парушэнне правілаў перавозкі пасажыраў.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

# МАРОЗ, МАРОЗ, ХАДЗІ КУЦЦЮ ЕСЦІ!

## Калядныя звычаі Лельчыцкага раёна

**Нездарма ў нас кажуць: «Што ні край — то свой звычай». На Убарцкім Палессі, а дакладней у Лельчыцкім раёне, шмат звычаяў, якія перадаюцца з пакалення ў пакаленне, і, нягледзячы на тое, што па планеце крочыць XXI стагоддзе, дагэтуль моцна іх прытрымліваюцца. Найбольш адметныя тут калядныя звычаі.**









У вёсцы Іванава Слабада ўвечары напярэдадні старога Новага года — часу Шчодрай куцці, рыхтуючы калядны стол, гаспадар кажа ў акно альбо дзверы: «Мароз, Мароз, хадзі куццю есці! Бо як прыйдзеш на раллю, я табе пугаю вушы адаб'ю!»

На стол кладзецца сена. І зусім не абавязкова пад абрус — каб вялася гаспадарка, каб карова дадому ішла, на свіннях сала расло, каб у агародзе буяла.

Жыхарка вёскі Ніна Шкарпінская прыгадвае: «У 12 гадзін апоўначы мы ідзём у хлеў паглядзець карову: калі яна ляжыць рагамі на ўсход — значыць, ацеліцца ўдзень. Калі павернута на поўдзень — ацёл будзе ноччу. Калі першым госцем на Раство будзе мужчына — у каровы будзе бычок, а калі жанчына — чакай цялушку».

Пра курэй Ніна Васільеўна кажа: «Трэба ў куратніку пасыпаць попелам з печы, каб куры несліся дома і не хадзілі да суседзяў. Калі калядні́кі, шчадруючы, сыплюць у акно зерне і пытаюцца: «Гаспадар, дзе вашы куры нясуцца?» — трэба адказваць: «У суседа грабуцца, а дома нясуцца!»

У вёсцы Тонеж раніцай 14 студзеня курам сыплюць зерне ў абруч ад бочкі альбо на нешта іншае круглай формы — каб несліся ў адным месцы.

Марыя Маркевіч, старэйшая жыхарка вёскі Іванава Слабада, раіць: «Калі прыходзяць калядні́кі і спяваюць пад акном, ім трэба абавязкова нешта даць. Бо калі не дасі, яны кажуць: «Святое Раство, каб вам хату разнясло!»

У Лельчыцкім рэгіёне распаўсюджаны звычай абвязвання саломаю дрэў у садзе: з 13 на 14 студзеня гаспадар ідзе ў сад абвязваць дрэвы звітай саломай — каб не памерзлі ад маразоў.

Гаспадыні вёсак Тонеж і Іванава Слабада прытрымліваюцца абавязковага звычаю класці пад стол з куццёю агародніну (бульбу, бурак, цыбуліну, часнок, моркву, гарбузікі і семкі) — каб быў добры ўраджай. Прыгаворваюць: «Зарадзі, Божа, на ўсякага долю!»

Вольга Карась, работнік культуры з гэтай вёскі, распавядае пра варажбу незамужніх дзяўчат на блінах: «Трэба ўзяць першы блін, пакласці пад паху і выйсці на вуліцу. Каго сустрэнеш першым — нарачоны будзе з гэткім жа іменем. У лёсе самой Вольгі выйшла менавіта гэтак: першым ёй трапіў мужчына з іменем Рыгор. Пазней лёс звёў з маладым гарманістам Рыгорам.

У лельчыцкіх палешукоў прынята на Шчадраца рабіць традыцыйныя стравы: куццю з ячных круп альбо грэчкі, калбасу мясную, крывянку, захалод (халоднае), боршч, бліны, смажаную рыбу, пампушкі. Пад стравы падкладваюць грошы — каб не пераводзіліся.

— Цяпер, дзякуй Богу, у нас усё ёсць, — кажуць людзі старэйшага пакалення ў Тонежы і Слабадзе. Гэта пасля вайны калядавалі, бо есці не было чаго. Мо таму і добра жывём, што Каляду спраўляем?

**Анатоль КЛЯШЧУК.**
**Фота аўтара.**

■ Прыемная навіна

# «ДОМІК БАРБІ» — ЮНЫМ ПАЛАЧАНАМ

**Добрым перадсвяточным падарункам для жыхароў Полацка стаў новы дзіцячы садок незвычайнай архітэктурнай формы. Ён вельмі падобны на домік любімай многімі дзяўчынкамі лялькі Барбі.**

Полацкі яслі-сад № 32 гасцінна расчыніў свае дзверы напярэдадні каталіцкага Раства — у самым вялікім па колькасці насельніцтва мікрараёне горада — Аэрапорт.



Прыемнай падзеяй для дзятвы, якая ўжо наведвае садок, стаў візіт губернатара Віцебшчыны. Ён прыехаў з рознымі падарункамі — для садка ў цэлым і кожнага хлопчыка і дзяўчынкі — паасобку. Ганаровы госць падкрэсліў, што пры будаўніцтве новых мікрараёнаў трэба паралельна ўзводзіць дзіцячыя дашкольныя ўстановы, школы, аб'екты для адпачынку і забаў.

Аб уладкаванні дзяцей у новы полацкі садок можна марыць. На будаўніцтва звонку насамрэч казачнага вялікага «доміка Барбі» вышынёй у тры паверхі патрачана больш як 30 мільярдаў рублёў. Адначасова ён можа прыняць 215 дзяцей. Для іх сярод іншага — басейн, так званыя «сухія» басейны, утульныя фізкультурная, гульнявая зала, пакой эстэтычнага выхавання... У кожнай з 12 груп — буфет. І на прылеглай тэрыторыі ўсё прадумана: ёсць веранды і ценявыя навесы, пляцоўкі для гульняў.

— Сёння ў Віцебскай вобласці ўзводзяцца новыя садкі для прыкладна 1,1 тысячы юных грамадзян. Каля 50 тысяч дзяцей наведваюць 630 дашкольных устаноў. Дзяржава надае самую пільную ўвагу паляпшэнню іх матэрыяльна-тэхнічнай базы. Трэба зрабіць так, каб з аднаго ў другі канец горада бацькі не вазілі дзіця ў садок, а трацілі на гэта максімум 15 хвілін, — сказаў Аляксандр Косінец, старшыня Віцебскага аблвыканкама.

Новыя садкі ў бліжэйшай перспектыве прымуць дзятву ў Віцебску (у мікрараёне Білева), Оршы, Аршанскім раёне, Наваполацку і ў Полацку.

— Сёлета ў горадзе нарадзілася больш за тысячу дзяцей. Таму распрацоўваецца праектна-каштарысная дакументацыя для ўзвядзення таксама ў мікрараёне Аэрапорт яшчэ адной установы дашкольнай адукацыі, — падзяліўся планамі Пётр Пяткевіч, намеснік старшыні Полацкага райвыканкама па сацыяльных пытаннях.

Старажытны Полацк і яго малады сусед Наваполацк упэўнена набліжаюцца адзін да аднаго. Каб іх яшчэ больш аб'яднаць, у планах — будаўніцтва новага моста цераз раку Заходняя Дзвіна. Каб задаволіць попыт на жыллё, па падліках спецыялістаў, штогод у гэтых двух гарадах трэба ўводзіць больш як 100 тысяч жылых квадратных метраў. І, безумоўна, спатрэбяцца новыя «дамы Барбі» для будучых маленькіх навасёлаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.**

*Полацк — Віцебск.*

*Установа адукацыі*
**«БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ»**

**АБ'ЯЎЛЯЕ КОНКУРС**
**на замяшчэнне наступных пасад:**

- кафедра фізічнага выхавання і спорту: старшы выкладчык, дацэнт, прафесар;
- кафедра тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый: старшы выкладчык, дацэнт;
- кафедра культуралогіі: дацэнт;
- кафедра этналогіі і фальклору: старшы выкладчык;
- кафедра рускай мовы як замежная: выкладчык, загадчык кафедры;
- кафедра псіхалогіі і педагогікі: старшы выкладчык;
- кафедра менеджменту інфармацыйна-дакументнай сферы: дацэнт;
- кафедра гісторыі Беларусі і музеязнаўства: выкладчык, дацэнт;
- кафедра беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры: дацэнт;
- кафедра замежных моў: старшы выкладчык, дацэнт;
- кафедра менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці: выкладчык (2), дацэнт (2), прафесар;
- кафедра беларускай і сусветнай мастацкай культуры: старшы выкладчык;
- кафедра інфармацыйных тэхналогій у культуры: старшы выкладчык;
- кафедра мастацтва эстрады: выкладчык (4), старшы выкладчык, дацэнт (2);
- кафедра харавога і вакальнага мастацтва: выкладчык (2), прафесар;
- кафедра духавой музыкі: старшы выкладчык;
- кафедра рэжысуры эстрады: дацэнт;
- кафедра тэатральнай творчасці: выкладчык;
- кафедра рэжысуры абрадаў і святаў: прафесар, загадчык кафедры;
- кафедра народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва: выкладчык, старшы выкладчык, дацэнт;
- кафедра харэаграфіі: выкладчык, загадчык кафедры.

**Наш адрас:**
**220001 г. Мінск, вул. Рабкораўская, 17.**
**Аддзел кадраў.**

*УНН 100286677*

■ Спадчына

# МІНУЛАЕ — ДЛЯ НАШЧАДКАЎ

### Славутая школа расійскага балета пачыналася ў Ружанах

**Рэканструкцыя Ружанскага палаца Сапегаў — гэта законная падстава ганарыцца ўсім, хто мае хоць нейкае дачыненне да ажыццяўлення праекта. А колькі было скептыкаў! Казалі, напрыклад: навошта траціць грошы? Дастаткова закансерваваць гэтыя руіны і паказваць іх рэдкім турыстам з акна аўтобуса: тут, маўляў, меў сваю рэзідэнцыю аўтар «Статута Вялікага Княства Літоўскага» і жылі яго нашчадкі. Але ж адолелі, адрэстаўравалі першую частку палаца — уязную браму. За год-другі ў музеі сабраліся экспанаты. І цяпер у яго не сорамна запрашаць турыстаў.**

Вядома, большасць кніг, карцін, іншых каштоўных рэчаў з палаца захоўваецца ў краінах блізкага і далёкага замежжа. У фондзе новага музея адна сапраўдная пячатка Сапегаў ёсць. Але і ёй ганарыцца дырэктар установы Руслан Кніга. Яго экскурсіі заўсёды цікавыя, заўсёды дазнаешся пра нешта новае. Напрыклад, колькі разоў даводзілася чытаць пра тое, якая знакамітая балетная трупа працавала ў Ружанскім палацы, як цаніў гэты балет кароль Станіслаў Аўгуст Панятоўскі. Аказваецца, у часы Расійскай імперыі, калі палац па вядомых прычынах канфіскавалі ў гаспадароў, трупа не перастала існаваць, прыгонныя акцёры не пайшлі працаваць на птушыны двор. Яны выехалі ў Пецярбург. Гэтая трупа стала асновай расійскага балета, які праславіўся лепшай у свеце балетнай школай. «А пачыналася гэтая балетная школа вось тут, у Ружанах», — з непрыхаваным гонарам гаворыць Руслан Кніга.

Не менш захапляльную экскурсію па Ружаншчыне для прадстаўнікоў СМІ арганізавала галоўны захавальнік фондаў музея «Пружанскі палацык» Наталля Пракаповіч. Магілёўцы, Лыскава, Баяры, Асошнікі — тут сапраўды ўсё дыхае гісторыяй. Дзве апошнія вёскі з пераліку заснавалі прывілеяваныя сяляне — ахоўнікі Белавежскай пушчы. Такіх паселішчаў абапал новай аб'язной дарогі шмат. А былое мястэчка Лыскава — радзіма магнатаў-асветнікаў. Тут жыў і быў пахаваны Францішак Карпінскі, паэт, перакладчык, педагог. А вяльможы ВКЛ і Рэчы Паспалітай Быхаўцы пабудавалі некалі манастыр місіянераў і прыгожы касцёл. Касцёл гэты чакае сваіх фундатараў і можа стаць яшчэ адной турыстычнай цікавінкай Ружанскага рэгіёна. Дарэчы, Ружаншчына — край унікальны яшчэ і тым, што па ёй праходзіць некалькі ўмоўных межаў. Напрыклад, моўна-этнаграфічных рэгіёнаў. Калі для вёсак на поўначы ад Ружан характэрна цэнтральна-беларуская гаворка, то на поўдні жыхары ўжываюць палескія дыялекты. Зноў жа на поўначы рэкі адносяцца да басейна Балтыйскага мора, а паўднёвыя цякуць у мора Чорнае.

Захаванне гісторыка-культурнай спадчыны — клопат улад. Старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін СУМАР на пытанне карэспандэнта «Звязды» аб перспектывах далейшай работы па адраджэнні гісторыка-культурнай спадчыны ў рэгіёне адказаў, што работа, несумненна, будзе працягвацца. У 2005 годзе ў вобласці быў створаны каардынацыйны савет па ахове матэрыяльнай і духоўнай спадчыны, куды ўвайшлі гісторыкі, навукоўцы, рэстаўратары. Паступова сталі выдзяляцца сродкі на рэстаўрацыйныя праекты. І сёння можна бачыць вынікі шэрагу паспяховых праектаў. Як вядома, першыя спробы аднавіць былую рэзідэнцыю Сапегаў рабіліся яшчэ пры Савецкім Саюзе. Але падзеі пачатку 1990-х адсунулі працу на многія гады. І толькі ў 2009 годзе ў Ружаны прыйшлі рэстаўратары. І вось ужо маем два будынкі былога палаца з прыстойным музеем, з віртуальнай бібліятэкай роду Сапегаў, якую ўдалося сабраць намаганнямі нашых бібліятэкараў пры падтрымцы бюро ЮНЕСКА ў Маскве.

Яшчэ адным набыткам на гэтым шляху стаў палац Нямцэвічаў у вёсцы Скокі Брэсцкага раёна. У сядзібе, узведзенай прыкладна ў 1770-я гады жыў Юльян Урсын Нямцэвіч, пісьменнік, дзяржаўны дзеяч, ад'ютант Тадэвуша Касцюшкі, адзін з аўтараў першай Канстытуцыі ў Еўропе. А яшчэ гэтыя сцены памятаюць значную гістарычную падзею. Менавіта тут 15 снежня 1917 года быў падпісаны пратакол аб ваенным перамір'і паміж Савецкай Расіяй і Германіяй, што паклала пачатак спыненню Першай сусветнай вайны на ўсходзе. Па сутнасці, гэты палац поўнасцю адбудаваны. За сем гадоў з бюджэту выдаткавана больш за восем мільярдаў рублёў.

Працягваюцца работы па аднаўленні Косаўскага палаца Пуслоўскіх. Кіраўнік вобласці заўважыў, што ў бліжэйшыя год-два не плануецца выдзяляць сродкі на тое, каб распачынаць новыя аб'екты. Трэба давесці да поўнага завяршэння пачатыя. Адны адрэстаўраваныя сцены трэба напоўніць зместам, дзе-нідзе патрабуецца добраўпарадкаванне тэрыторый. А каардынацыйны савет будзе распрацоўваць новыя праграмы. Гэта работа не аднаго года, не аднаго дзесяцігоддзя. Але яна патрэбна для нашчадкаў.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

Фота слова Яўгена Пясецкага

*Спазнілася зіма — не чую маразоў.*
*Відаць, з калядных дзён вясна пачнецца,*
*І вернуцца шпакі з далёкіх берагоў,*
*І ручаінка песняй адгукнецца.*

*Спазнілася... Але, усе календары*
*І той адзін, што сонцу скон прарочыў,*
*Склікаюць адусюль сцюдзёныя вятры,*
*Каб край забыўся у завейнай ночы.*

*Чарга зімовых дзён разнеслася, як дым,*
*І час паперам не адпавядае —*
*Ілгуць календары, а ісціна — у тым,*
*Што перад сонцам сцюжа адступае.*



■ Соцыум

# НЕ ЗГУБІЦЬ ЧАЛАВЕЧАЕ АБЛІЧЧА

**Спачатку яны нават выклікалі ў мяне спачуванне: сціплыя, стаяць з вінаватым выглядам, баяцца грознага папярэджання трапіць у ЛПП. Але, калі пачула «дасье» на кожнага з гэтых «ціхонь», уражанні хутка змяніліся. Нездарма ж кажуць, што ў ціхім балоце чэрці водзяцца.**

Дарэчы, па статыстыцы, Шклоўскі раён па п'янстве адзін з лідараў. Па звестках абласнога наркадыспансера, летась за 9 месяцаў ён пры сярэднестатыстычных 7,7 літра спірту на душу насельніцтва па Магілёўшчыне «выпіваў» ажно 9,7 літра. І значыўся другім сярод 21 раёна пасля Круглянскага, дзе лічба наогул жахлівая — 13 літраў на кожнага жыхара. Але нельга казаць, што ў Шклоўскім раёне нічога не робіцца, каб выправіць становішча. Пры райвыканкаме створаны грамадскі пункт аховы парадку, які сістэматычна разглядае справы тых, якія вызначыліся падчас злоўжывання спіртнымі напоямі. На адным такім пасяджэнні я і пабывала.

Камісія, у якую ўвайшлі супрацоўнікі раённага аддзела ўнутраных спраў, аддзела па надзвычайных сітуацыях, урач-нарколаг, узначаліў начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі райвыканкама Сяргей Артамонаў. Планавалі разгледзець справы 23 выпівох, але не ўсе аматары гарэлкі да гэтай сустрэчы падрыхтаваліся. Адзін і зусім ледзьве трымаўся на нагах. Прыйшлося адкласці выхаваўчы працэс.

У пакой заходзіць мужчына, узрост якога за 60. На від — сціплы, спакойны, ад сораму гатовы скрозь зямлю праваліцца.

Я нават вушам не веру, калі пачынаюць пералічваць яго «заслугі». «16 снежня падчас сваркі з жонкай нанёс ёй 2 удары драўлянай ручкай па галаве і па плячы. 20 снежня на лесвічнай пляцоўцы дома крычаў, лаяўся, на заўвагі не рэагаваў...»

— Пасля гэтага ён зноў паспеў з жонкай пасварыцца, — дадае начальнік РАУС Аляксандр Піменаў. — Зноў затрымлівалі яго, разбіраліся.

**«А калісьці быў добрым майстрам, меў сям'ю, але з-за гарэлкі ўсё страціў. Быў асуджаны за катаванне жонкі і сына. Калі піць пачынае, становіцца зверам. У апошні час тэрарызуе сваіх бацькоў. Маці, калі бачыць на парозе дома свайго сына, тэлефануе ў міліцыю: маўляў, ратуйце».**

«Герой» пакорліва ківае галавой, разводзіць рукамі: маўляў, чорт паблытаў. Потым вінавата мямліць: «Я больш не буду».

Дарэчы, «ціхоня» нават стаіць на ўліку ў нарколага. Члены савета прыходзяць да выніку, што буйнага пенсіянера было б нядрэнна на год адправіць у ЛПП. Мужчына жаласна просіць: маўляў, не трэба. А калі начальнік РАУС абяцае завесці на яго крымінальную справу па артыкуле «Катаванне» за сістэматычныя здзекі з жонкі, на твары аматара выпіць і пабуяніць з'яўляецца непадзельны спалох. «Гэтым артыкулам прадугледжана да 3 гадоў пазбаўлення волі», — словы з вуснаў міліцыянера гучаць для старога як прысуд. Ён маўчыць і толькі нервова ківае галавой. Не вельмі хочацца на старасці гадоў садзіцца ў турму на 3 гады. Але калі да канца месяца не возьмецца за розум, гэта можа спраўдзіцца.

Чарговы кліент — 37-гадовы мужчына. Разам з сястрой ён мае слабіну да «зялёнага змея». Сястра дапілася да таго, што трапіла ў ЛПП. Брат таксама мае ўсе шанцы рушыць услед за ёй.

«20 снежня ў 18.30 знаходзіўся ў доме ў нецвярозым стане, хістаўся, з рота ішоў непрыемны пах», — зачытвае радкі з пратакола аб адміністрацыйным правапарушэнні Сяргей Артамонаў.

І гэта не першы выпадак у жыцці мужчыны. Апошні раз ён нават атруціўся гарэлкай і трапіў у рэанімацыю. Члены савета спрабуюць падлічыць, колькі яго лячэнне абышлося дзяржаве. Паўмільёна, не менш. «А колькі вы зарабілі за гэты месяц?» — пытаюцца ў выпівохі.

— Нiколькі, — разводзіць рукамі ён. — Я яшчэ працу сабе не знайшоў. Так, калым нейкі, каб было на што паесці.

— Гэта не справа, — не стрымлівае абурэння Сяргей Артамонаў. — Ведаю я гэтую падзёншчыну. Расплата за яе — кавалак хлеба і шклянка гарэлкі, каб горла не шчыміла. Трэба такая праца, ад якой і вам, і дзяржаве была б пэўная карысць.

Высвятляецца, што беспрацоўны — слесар-сантэхнік. «У раёне хапае вакансій па вашай спецыяльнасці, — кажа супрацоўнік райвыканкама. — Чаму ж не працуеце?» Каб пазбегнуць ЛПП, мужчына павінен на працягу трох тыдняў працаўладкавацца і кадзіравацца. Ён спрабуе спрачацца наконт кадзіравання: маўляў, грошы яшчэ не зарабіў. «Калі вы возьмецеся за розум, вам пойдуць насустрач і райвыканкам, і РАУС, і МНС, — абяцае Сяргей Артамонаў і заклікае да сумлення. — Вы ж яшчэ не страчаны для грамадства чалавек».

Члены камісіі ўдакладняюць, ці выканаў мужчына прадпісанні ратавальнікаў наконт пажарнай бяспекі? Ці перастаў курыць у ложку? На жаль, гэта самыя распаўсюджаныя прычыны пажараў у кватэрах такіх гора-жыхароў. Але суразмоўца клятвенна запэўнівае, што тут ён выправіўся.

Калі заходзіць яшчэ адзіны кліент, «кактэйль» з пахаў бруднага адзення і шматдзённага запою шыбае ў нос. Пад вокам — сіняк. Мужчыну 35 гадоў.

— А калісьці быў добрым майстрам, меў сям'ю, але з-за гарэлкі ўсё страціў, — канстатуе начальнік РАУС. — Быў асуджаны за катаванне жонкі і сына. Калі піць пачынае, становіцца зверам. У апошні час тэрарызуе сваіх бацькоў. Маці, калі бачыць на парозе дома свайго сына, тэлефануе ў міліцыю: маўляў, ратуйце. Дарэчы, таксама вялікая аматарка выпіць.

Афіцыйна мужчына нідзе не працуе, ездзіць на заробкі ў Маскву. «Сёння нават кроплі ў рот не браў», — запэўнівае ён, спасылаючыся на тое, што хадзіў у паліклініку. Скардзіцца на дрэннае здароўе, хворы пазваночнік. «Мяне кладуць у бальніцу. А пасля таго, як падлячуся, уладкуюся на працу», — абяцае ён. «Калі вас нарад міліцыі сустрэне на вуліцы п'яным, пойдзеце пад суд», — папярэджвае Сяргей Артамонаў.

Бываюць і кур'ёзныя здарэнні. Пенсіянер страціў тэлефон, а стрыечны брат, з якім ён выпіваў, параіў схадзіць у РАУС. Ён пад хмяльком і пайшоў. «Чорт паблытаў, — здзіўляўся з сябе стары. — Сам на сябе заяву напісаў. Ну не дурань?» «А ўсё таму, што гарэлку пілі, — кажуць члены камісіі. — Былі б цвярозымі, ніякіх прыгод не было б». Слабасць да выпіўкі яшчэ і на здароўе адбіваецца: мужчына перанёс аж 5 інфарктаў. Але адмаўляцца зусім ад спіртнога ён, між тым, не збіраецца. «Я толькі ў лячэбных дозах», — просіць дазволу ён. Але камісія не збіраецца ісці на ўступкі і дае пенсіянеру апошняе папярэджанне.

На жаль, саскочыць са шклянкі не так проста. Нарколагі нават лічаць гэтых людзей хранічнымі хворымі, як, напрыклад, сардэчнікаў. Можа наступіць устойлівы перыяд рэмісіі, але 100% гарантыі, што чалавек зноў не возьмецца за старое, няма. Але без гэтых «чыстак», становішча было б зусім дрэнным.

— Дастаткова аднаго правапарушэння, каб трапіць на разгляд камісіі, — кажа начальнік Шклоўскага РАУС Аляксандр Піменаў. — Калі чалавек трапіў сюды ўпершыню, гэта мае вельмі вялікі эфект. Самі ж бачылі, у некаторых стаялі слёзы на вачах, ім было сапраўды сорамна. А прыводзілі неяк маладога чалавека, справу якога неаднойчы разглядалі на камісіі, яму ўсё «да лямпачкі». Але мы павінны рабіць усё, каб палепшыць становішча. Асноўная прычына крыміногеннай сітуацыі ў раёне — гэта п'янства. Найбольшая колькасць асабліва цяжкіх злачынстваў здзейснена менавіта на глебе злоўжывання алкаголем. У канцы мінулага года адна звар'яцелая ад гарэлкі жыхарка Шклова, якую і жанчынай можна назваць умоўна, падпаліла дом з людзьмі — там знаходзілася трое яе сабутэльнікаў. Усе яны загінулі. А колькі сямейных драм, пабітых, пакалечаных лёсаў, сцэн сямейнага гвалту! І гэта ўсё алкаголь...

Гэтыя пасяджэнні і праводзяцца дзеля таго, каб заклікаць людзей да розуму, прыняць дадатковыя меры, акрамя міліцэйскіх, прымусіць людзей задумацца над сваімі паводзінамі — прайсці курс медыцынскай рэабілітацыі, а потым працаўладкавацца і прыносіць карысць дзяржаве і сабе. «За апошнія 2 гады мы змаглі вярнуць да нармальнага жыцця 3 жанчын-маці, — кажа Аляксандр Аляксандравіч. — Калі паўстала пытанне адправіць іх у ЛПП, яны закадзіраваліся і пайшлі працаваць. Усім вярнулі дзяцей, і зараз яны паўнапраўныя члены грамадства. Значыць, тое, што мы робім, — гэта не дарэмна».

**Нэлі ЗІГУЛЯ**

### У ТЭМУ

**— Каб змагацца з праблемай, праводзім кожны месяц дні цвярозасці, — кажа начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі Шклоўскага райвыканкама Сяргей Артамонаў. — Раз у квартал на тэрыторыі аднаго з сельвыканкамаў ладзім зону цвярозасці. А яшчэ па прапанове нашага старшыні райвыканкама Аляксандра Бойкі ўсе грамадскія таварыствы прымаюць удзел у гэтай справе. Існуе графік дзяжурства, па якім усе ўстановы па чарзе наведваюць сем'і, што стаяць на прафілактычным уліку ў РАУС. Старшыня райвыканкама кажа, што калі сёння да парушальнікаў прыйдуць прадстаўнікі БРСМ, заўтра Чырвонага Крыжа, а паслязаўтра Беларускага саюза жанчын, то станоўчы вынік будзе.**

■ Асцярожней трэба!

# ДЗЕ ПАСЛАЦЬ САЛОМКУ?

**Да 60 працэнтаў усіх траўмаў у нашай краіне адносіцца да ліку бытавых, каля 20 працэнтаў — вулічныя. Самымі распаўсюджанымі з'яўляюцца раны, пераломы і вывіхі.**

— Штогод у краіне атрымліваюць траўмы каля 120 тысяч дзяцей, — адзначае **загадчыца аддзялення медыцынскай рэабілітацыі 23-й дзіцячай гарадской паліклінікі г. Мінска Ганна КУЛЯБА.** — Дзеці нярэдка цяжка траўмуюцца і нават гінуць у выніку атрыманай траўмы. 50 працэнтаў траўмаў прыпадае на ўзрост 8–14 гадоў, 25 працэнтаў — на 4–7 гадоў. Пры гэтым у 55 працэнтах выпадкаў дзеці траўмуюцца, гуляючы ў дварах, у 43 працэнтах — дома. Дарослыя павінны так арганізаваць догляд дзіцяці, каб выключыць магчымасці атрымання траўмаў…

Дзеці груднога ўзросту поўнасцю знаходзяцца пад назіраннем дарослых, а таму віноўнікамі нешчаслівага здарэння з такім дзіцем з'яўляюцца выключна апошнія.

У раннім дашкольным узросце дзіця мае патрэбу ў назіранні не толькі ў хатніх умовах, але і ў абстаноўцы дзіцячай дашкольнай установы. Значыць, адпаведныя растлумачэнні павінны давацца як персаналу, так і самім дзецям.

Падчас догляду дзяцей трэба памятаць пра высокую пагрозу апёкаў, абарону балконаў, лоджый, вокнаў спецыяльнымі сеткамі, пра небяспеку магчымых траўмаў у двары, на лесвічнай клетцы, падчас падзення і аўтамабільных здарэнняў. У школьным узросце варта тлумачыць дзецям пра небяспеку выбухованебяспечных рэчываў, транспартны траўматызм, вытрымліванне мер бяспекі падчас урокаў фізкультуры.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

***Гадзіны траўмы***

У краіне захоўваюцца высокія паказчыкі дарожна-транспартнага траўматызму. Гэта досыць цяжкія траўмы, з працяглым лячэннем у стацыянары і высокай лятальнасцю. Паводле шматгадовых назіранняў, найбольшая колькасць ДТЗ з цяжкімі траўмамі і лятальным зыходам прыпадае на чацвер-пятніцу, найменшая — на нядзелю-панядзелак. Пікам аварыйнасці лічыцца час з 15 да 21 гадзіны, час года — кастрычнік — снежань.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

■ Лад жыцця

# Дыябет у дзяцей

Цукровы дыябет у дзяцей выяўляецца ў розным узросце, аднак найчасцей — у дашкольным і школьным (ад 5 да 13 гадоў). Захворванне рэгіструецца аднолькава часта як у хлопчыкаў, так і ў дзяўчынак. Вялікае значэнне мае спадчынная схільнасць, аднак спрыяюць таксама перакормліванне, лішак вугляводаў і тлушчу ў харчаванні, фізічныя і псіхалагічныя траўмы — траўмы галавы, жывата, моцныя перажыванні, спалох, інфекцыйныя хваробы (эпідэмічны паратыт, адзёр, ветраная воспа, шкарлятына, грып, хвароба Боткіна).

— Захворванне абумоўлена павышанай сакрэцыяй гармонаў — антаганістаў інсуліну, — тлумачыць **валеолаг 23-й гарадской дзіцячай паліклінікі г. Мінска Алена ГАРНІЦКАЯ.** — Пры адсутнасці інсуліну тканкі не засвойваюць глюкозу, парушаюцца акісляльна-аднаўленчыя працэсы. Пры назапашванні недаакісленых прадуктаў развіваецца дыябетычная кома. У дзіцячым узросце з-за інтэнсіўных працэсаў росту і вялікага расходу энергіі патрэба ў інсуліне больш высокая, што хутчэй прыводзіць да знясілення непаўнацэннага інсулярнага апарату і развіццю дыябету…

Цукровы дыябет у дзяцей можа развівацца паступова, аднак прыкладна ў кожнага трэцяга пачатак бурны — дзеці трапляюць у стацыянар у пачатку комы. Найбольш раннім сімптомам цукровага дыябету з'яўляецца ўзмоцненая смага, пры якой выпіваецца 1500–3000 мл вадкасці за суткі. Гэты стан звязаны з абязводжваннем арганізма, павышэннем канцэнтрацыі хларыду натрыю, мачавіны, глюкозы ў крыві. Адпаведна павялічваецца колькасць мачы, якая выдзяляецца — да 3 л у суткі. Плямкі хворых немаўлят становяцца пры высыханні цвёрдымі, нібы накрухмаленымі. Хворыя дзеці маюць павышаны апетыт: абменныя парушэнні змяняюць састаў крыві, уздзеянне «галоднай» крыві на харчовы цэнтр выклікае адчуванне голаду. Пры павышаным апетыце і празмерным ужыванні ежы дзіця худзее. Скура становіцца сухой. Магчыма развіццё стаматыту, парадантозу з расхістваннем зубоў. Павялічваецца печань. Могуць назірацца аслабленне памяці, зніжэнне паспяховасці, стамляльнасць. Зніжаецца супраціўляльнасць інфекцыям, лёгка далучаецца фурункулёз, магчыма развіццё і туберкулёзу. Пры даследаванні крыві раніцай нашча вызначаецца гіперглікемія (павышаная колькасць цукру) — 11,1–16,5 ммоль/л. Для цукровага дыябету характэрна наяўнасць цукру ў мачы. Павялічваецца і колькасць халестэрыну ў крыві — вышэй за 5,2 ммоль/л. Магчыма развіццё такіх ускладненняў, як цыроз печані, полінеўрыт, катаракта, рэцыніт, дыстрафія касцявой тканкі.

Своечасовае і сістэматычнае лячэнне дазваляе захоўваць жыццё на працягу многіх гадоў. Дзіця працягвае вучыцца ў звычайнай школе, змяншаюцца толькі фізічныя нагрузкі.

**Святлана БАРЫСЕНКА**

***Што рабіць, каб не дапусціць?***

Адзін з самых эфектыўных спосабаў — прафілактыка атлусцення. Адсюль парады па харчаванні — уключэнне ў рацыён цэльназерневых прадуктаў (хлеб грубага памолу, крупы), якія, у адрозненне ад рафінаваных, не павышаюць узровень цукру ў крыві; выдаленне з рацыёну прадуктаў з транстлушчамі, маргарынам. Па фізічнай нагрузцы — абавязковыя практыкаванні, плаванне, актыўныя гульні.

■ Дзённік настаўніка



# УСЕ ДЗЕЦІ РОЗНЫЯ,
## або Ці трэба ацэньваць урок фізкультуры?

Усе дзеці розныя. Па знешнім выглядзе, па характары і тэмпераменце, па разумовых і фізічных здольнасцях.

Вось аб гэтым, апошнім, я і хацеў бы крыху паразважаць...

На жаль, не ўсім аднолькава дадзена ад прыроды. І калі адзін вучань лёгка можа падцягнуцца альбо выканаць пад'ём тулава менавіта столькі разоў, колькі і патрабуецца для атрымання «дзясяткі», то другі — толькі на слабую «троечку» зможа гэта зрабіць. Не таму, што лянуецца, проста фізічна не ў стане...

І ў выніку атрымлівае адпаведныя балы...

Уяўляеце, які гэта стрэс для дзіцяці, тым больш, калі па ўсіх астатніх прадметах ён круглы выдатнік. І суцяшэнні кшталту, што, маўляў, нічога страшнага, усё роўна гэтая адзнака на сярэдні бал атэстата ніяк не паўплывае, тут толькі часткова могуць дапамагчы. Ды й то не кожнаму...

Але ж як настаўнік можа паставіць такому вучню высокую адзнаку, калі існуюць нарматывы? А там усё дакладна распісана: у якім узросце і за які вынік выстаўляецца вучню той ці іншы атэстацыйны бал.

Там не ўлічана толькі тое, што ўсе дзеці розныя...

І нават тое не ўлічваецца, наколькі гэты вучань палепшыў паказчыкі свайго фізічнага стану на працягу навучальнага года. Напрыклад, адзін вучань (фізічна развіты ад прыроды) і пачаў, і скончыў навучальны год з аднымі і тымі ж вынікамі (па бегу, скачках у даўжыню, па падцягванні). Гэта значыць, за цэлы год — аніякага прагрэсу!

Але ўсё роўна атрымае «дзясятку», бо з лёгкасцю ўкладваецца ў нарматывы.

А ў другога напрыканцы навучальнага года значны прагрэс! Скокнуў у даўжыню на дзесяць сантыметраў далей, чым было ў верасні. Падцягнуўся аж на два разы больш, прабег пэўную дыстанцыю крыху хутчэй...

І якая ж узнагарода вучню за тое, што цэлы год ён паступова паляпшаў уласныя рэкорды, упарта дзеля гэтага трэніруючыся?

Ды амаль аніякай!

Замест «тройкі», магчыма, паставяць яму «чацвёрку», бо па нарматывах так выходзіць...

Наогул, а ці патрэбны адзнакі на ўроках фізкультуры? А калі патрэбны, то за што іх выстаўляць?

За вынікі? За стараннe?

Дарэчы, прынцыповыя настаўнікі нават за адсутнасць у вучня спартыўнай формы на ўроках фізкультуры могуць уляпіць яму «адзінку» (на вучнёўскім жаргоне — «кол»), і аргументуюць патрэбнасць адзнак нават тым, што інакш некаторых вучняў не прымусіш спартыўную форму апранаць...

Так што адзнакі на ўроках фізкультуры, хутчэй за ўсё, патрэбны. А вось што датычыцца нарматываў...

Вядома ж, настаўніку фізкультуры патрэбны моцныя, фізічна развітыя вучні. Каб прыклад паказвалі астатнім, каб адстойвалі гонар школы на разнастайных раённых (і не толькі) спаборніцтвах. І чым больш прызавых месцаў на гэтых спаборніцтвах атрымлівае школа — тым вышэй ацэньваецца праца настаўніка фізкультуры.

І гэта цалкам справядліва.

Ды і многія вядомыя спартсмены пачыналі свой шлях да алімпійскіх вяршынь менавіта са школы. З урокаў фізкультуры, са спартыўных гурткоў. І, апавядаючы журналістам аб трэнерах, першым сваім трэнерам нязменна называлі школьнага настаўніка фізкультуры. Гэта ён своечасова заўважыў перспектыўнага вучня, гэта пад яго чулым кіраўніцтвам будучы алімпійскі чэмпіён зрабіў свае самыя першыя крокі ў вялікі спорт.

Вось толькі ці будуць з такой жа цеплынёй успамінаць сваіх настаўнікаў фізкультуры будучыя дактары фізіка-матэматычных навук, будучыя вялікія музыканты і мастакі, будучыя ўрачы і педагогі? Упэўнены, што для некаторых з іх менавіта школьныя ўрокі фізкультуры застануцца адным з самых змрочных успамінаў дзяцінства.

Самыя нізкія паказчыкі (а значыць, і адзнакі) у класе, пастаянныя насмешкі і кпіны з боку аднакласнікаў і нават настаўнікаў... а тут яшчэ дома патрабуюць, каб аніводнага нізкага бала ў дзённіку! Слёзы, істэрыка, катэгарычная адмова з боку вучня наведваць ненавісныя ўрокі... і, у рэшце рэшт, бацькі ўсімі праўдамі і няпраўдамі здабываюць свайму чаду даведку аб вызваленні ад урокаў фізкультуры...

Але ж гэта не лепшы варыянт. Бо менавіта такім слабым дзецям фізкультура патрэбна нават больш, чым усім астатнім! Толькі вось патрэбна яна ім, у першую чаргу, для элементарнага аздараўлення і правільнага фізічнага развіцця, а не для дасягнення непамерна высокіх для сябе спартыўных вынікаў. Для гэтага, дарэчы, у школах гурткі і секцыі існуюць.

Праўда, у апошні час можна бачыць перамены да лепшага. З'явіліся так званыя альтэрнатыўныя нарматывы: хадзьба замест бегу, кіданне мяча замест скачкоў у даўжыню (магчыма, я штосьці блытаю, няхай прабачаць мне настаўнікі фізкультуры!).

Але ж хоць яны і альтэрнатыўныя, ды ўсё ж таксама нарматывы! Бо не проста так трэба той мячык шпульнуць, а на пэўную адлегласць. І хто далей яго закіне, таму і адзнака вышэйшая...

А яшчэ за тэарэтычныя веды на ўроках фізкультуры адзнаку атрымаць можна. І тут ужо не фізічныя дадзеныя вучню дапамагаюць, а, у першую чаргу, разумовыя. Плюс — стараннасць, уседлівасць, унутраная дысцыпліна і карысная звычка рыхтаваць дома ўсе хатнія заданні, прычым па любых прадметах...

І ўсё ж тэорыя тэорыяй, а нарматывы нарматывамі. І калі за тэорыю балы будуць высокія, а вось за выкананне нарматываў, на жаль, значна ніжэйшыя, агульная гадавая адзнака высокай, хутчэй за ўсё, не будзе.

Мне ж здаецца, што калі вучань заўсёды прыходзіць на ўрокі фізкультуры ў форме, дысцыплінавана там сябе паводзіць і старанна выконвае ўсё тое, што паказвае настаўнік — ён ужо заслугоўвае высокай адзнакі, незалежна ад таго, якія нарматыўныя вынікі паказвае.

Такое вось маё, магчыма, і «дылетанцкае» меркаванне.

**Генадзь АЎЛАСЕНКА**

■ Пытальнік

# ДА СЯРЭДЗІНЫ ЛЕТА ПРАВАДНОЕ РАДЫЁ Ў РАЁНЕ АДКЛЮЧАЦЬ ЦАЛКАМ

***Звяртаемся да вас, каб удакладніць, чаму нам з 20 снежня мінулага года адключылі радыё? У раёне сказалі, што гэта планавае мерапрыемства і праводзіцца яно на рэспубліканскім узроўні. Мы хочам ведаць, ці так гэта. Палова жыхароў пасёлка не купіць гэтыя прыёмнікі і будзе адрэзана ад свету. Мы прасілі не адключаць нам радыё — няхай нават павялічаць абанплату. Чамусьці на ўсё цэны павялічваюцца, а плата за радыё складае за месяц менш за дзве тысячы рублёў. Вось чаму не хапае грошай на рамонт радыёліній. Як інакш патлумачыць прычыну адключэння?***

**Жыхары вёскі Нача Ляхавіцкага раёна.**

Калі коратка, каб не паўтарацца (бо на гэтую тэму наша газета ўжо неаднойчы пісала), дык прычына адключэння праваднога радыё — у састарэласці тэхналогіі. І адключэнне сапраўды пакрысе будзе весціся па ўсёй краіне.

— І ў нашым раёне праводзяцца такія работы. Нача — не першы населены пункт, дзе праваднoe радыё ўжо адключана, — распавёў нам у тэлефоннай гутарцы начальнік Ляхавіцкага раённага вузла электрасувязі Анатоль Лукашэвіч. — Але перад тым, як пайсці на такі крок, за месяц да адключэння, нашы работнікі брыгадамі па 6-8 чалавек выязджалі ў кожную вёску і абышлі практычна кожны дом, каб папярэдзіць пра тое. Хіба толькі каго выпадкова не заспелі. Ведаю, што некаторыя жыхары выказваюць сваю нязгоду, яны і да мяне звярталіся, але трэба разумець адно: ідзе паступовы пераход ад праваднога радыё да УКВ. Па нашым раёне гэтыя работы, калі ўсё пойдзе, як намечана, плануецца завяршыць недзе да 1 ліпеня гэтага года.

Як паведаміў далей Анатоль Тадэвушавіч, насельніцтву прапануюцца УКВ-прыёмнікі айчыннай вытворчасці коштам па 165 тысяч рублёў. Прычым, як варыянт, іх можна набыць нават у растэрміноўку. Дарэчы, у сувязі з тым, што ў вёсцы Нача праваднoe радыё ўжо адключана, абанплата за яго не бярэцца. Не будзе яе і ў далейшым.

■ Бяспека

## ЗІМЫ НЯМА, А НА ЛЁД ЦЯГНЕ

**На возера ў адным з мікрараёнаў Гомеля пайшоў выгульваць свайго сабаку 20-гадовы жыхар абласнога цэнтра.**

Паўтарасантыметровы лёд не вытрымаў, і малады чалавек апынуўся ў вадзе, за 25 метраў ад берага, дзе глыбіня вадаёма — каля 3 метраў. На яго шчасце, выратавальнікаў выклікаў выпадковы сведка. Пры дапамозе дошкі супрацоўнікі МНС выцягнулі пацярпелага і перадалі яго брыгадзе хуткай медыцынскай дапамогі з дыягназам «пераахаладжэнне».

Аналагічнае здарэнне — але ж з двума аматарамі зімовай рыбалкі — адбылося ў затоцы ракі Сож. Па інфармацыі прэс-службы ўпраўлення МНС, маладзейшы з рыбакоў выкараскаўся сам, а 58-гадовага выцягнуў вадалаз. Мужчыну даставілі ў бальніцу хуткай медыцынскай дапамогі.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ**

## СУПРАЦЬ ІНСПЕКТАРАЎ НА ТОНКІМ ЛЁДЗЕ...

**На возеры Ломыш у межах Палескага дзяржаўнага радыяцыйна-экалагічнага запаведніка работнікі Мазырскай міжрайінспекцыі затрымалі жыхара Нароўлі, які незаконна здабыў трыма сеткамі 74 асобіны розных відаў рыбы.**

Пры затрыманні парушальнік не падпарадкаваўся, неаднойчы спрабаваў збегчы, штурхаў на тонкім лёдзе супрацоўнікаў інспекцыі, падвяргаючы іх небяспецы. Дзяржінспектарам давялося прымяніць фізічную сілу. За незаконную лоўлю рыбы, якая пацягнула нанясенне шкоды прыроднага асяроддзю ў асабліва буйным памеры (217 базавых велічынь), заведзена крымінальная справа. Парушальніка змясцілі ў ізалятар часовага ўтрымання. Давядзецца яму адказваць і за непадпарадкаванне службовай асобе.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Усходні гараскоп



# САКРЭТ ПОСПЕХУ АД СІНЯГА ДРАЎЛЯНАГА КАНЯ: АДКІНУЦЬ ЭГАІЗМ І ПЕРАГЛЕДЗЕЦЬ СТАСУНКІ З ЛЮДЗЬМІ

Паводле ўсходняй традыцыі, Новы год надыходзіць не 1 студзеня, а на другі маладзік пасля даты зімовага сонцастаяння — гэта прыкладна паміж 20 студзеня і 20 лютага. Сёлета Год Сіняга (Зялёнага) Драўлянага Каня зменіць год Чорнай Змяі 31 студзеня і працягнецца да 18 лютага 2015 года.

Што ж прынясе гаспадар года іншым сваім суседзям па ўсходнім календары? Паводле слоў астролага, нумаролага Аліны ВОЛКАВАЙ, усім без выключэння знакам у год Каня варта рухацца да пастаўленых мэт цярпліва і настойліва, а за справы брацца з усёй душой. «Працалюбства, вынослівасць, імпэт, шчырасць, трываласць і творчы пачатак — вось асноўныя характарыстыкі 2014 года паводле ўсходняй традыцыі. Даварайце сваёй інтуіцыі, але ўсё ж прытрымлівайцеся загадзя пракладзеных маршрутаў і вельмі прыдзірліва выбірайце сродкі і метады, якія збіраецеся выкарыстоўваць. Найбольш жа поспех чакае тых, у каго атрымаецца, як у самога Каня, зладжана дзейнічаць з усім калектывам і пры гэтым захоўваць сваю індывідуальнасць».



**ПАЦУКАМ** *(1924, 1936, 1948, 1960, 1972, 1984, 1996, 2008)* у гэтым годзе давядзецца рухацца і працаваць «з усіх лап», а часам нават за дваіх. Нішто не дастанецца ім проста так, без усякіх высілкаў. Шмат каму ўдасца «рэанімаваць» і працягнуць адкладзеныя раней справы, якія падаваліся перспектыўнымі, пачаць уласны бізнес, атрымаць дадатковую адукацыю. Неаднаразова Пацукі могуць выступіць завадатарамі нейкіх маштабных мерапрыемстваў, сацыяльных, дабрачынных праграм, якія ў будучым прынясуць плён. Варта толькі не забывацца час ад часу дазваляць сабе «пяціхвілінку ляноты» ў коле блізкіх людзей: яны не толькі дазволяць вам адпачыць і аднавіць сілы, але таксама скарэктуюць вашы ідэі пры дапамозе здаровай крытыкі.



**БЫКУ** *(1925, 1937, 1949, 1961, 1973, 1985, 1997, 2009)* гаспадар года сімпатызуе як роўнаму, таму дасць магчымасць урэгуляваць многія пытанні, якія даўно выклікаюць непакой. У 2014 годзе будуць атрымлівацца тыя справы, якія запатрабуюць партнёрскіх адносін. Атрымаецца ўсталяваць новыя кантакты і ўмацаваць старыя сувязі. Тое ж датычыцца асабістага жыцця: вы, як ніколі, можаце давяраць партнёру, а калі другой «палавінкі» ў вас яшчэ няма, то шанцы яе сустрэць у першай палове года вельмі вялікія. Маючы за спінай надзейны тыл і поўную сямейную гармонію, Бык без перасцярог зможа кінуцца ў бой за свае інтарэсы ў працы, фінансах, грамадскім жыцці.



**ТЫГРАМ** *(1926, 1938, 1950, 1962, 1974, 1986, 1998, 2010)* спатрэбяцца ўсе наяўныя рэсурсы напору і адвагі. Ужо ў самым пачатку года давядзецца праявіць свае лідарскія якасці, каб пазбавіцца самому і вызваліць блізкіх ад усіх тых непатрэбных рэчаў, стасункаў і акалічнасцяў, якія ляжаць мёртвым грузам і перашкаджаюць развівацца, рухацца наперад. Але не блытайце настойлівасць з агрэсіўнасцю: другая не толькі не прынясе поспеху, а справакуе шэраг канфліктаў, уладжваць якія давядзецца да лета, а то і даўжэй. Вам спатрэбяцца тактоўнасць і ўменне весці перамовы — так-так, давядзецца ісці на кампраміс, каб рэалізаваць намечаныя планы.



**ТРУСУ** *(1927, 1939, 1951, 1963, 1975, 1987, 1999, 2011)* Конь прынясе абнаўленне ва ўсіх жыццёвых сферах. Новыя магчымасці з'явяцца з розных бакоў, пераважна ў выніку ўмацавання сацыяльных сувязяў — самыя, здавалася б, выпадковыя сустрэчы і мімалётныя знаёмствы могуць аказацца вельмі важнымі. Таму ўважліва пастаўцеся да кожнага новага чалавека ў вашым жыцці. Не дазваляйце сумневам і ўспамінам мінулага ахапіць вас і збіць са шляху. Больш давярайце сённяшняму, чым учарашняму, каб не ўпусціць нейкі важны шанц. Некаторыя Трусы пад наплывам пачуццяў будуць дабівацца ўзаемнасці ад чалавека, што да іх абыякавы. Тут усё залежыць ад вас: калі не апусціце рукі і не пабаіцеся выглядаць смешным, сітуацыю можна будзе перамяніць сабе на карысць і дасягнуць таго, да чаго вы імкняцеся.



**ДРАКОНУ** *(1928, 1940, 1952, 1964, 1976, 1988, 2000, 2012)* варта памятаць адно: што б ні адбывалася, зоркі на яго баку. Смелых любіць удача — гэта пра вас. Галоўным дарам нябёсаў стане адчуванне глыбокай унутранай свабоды, і праявіцца гэта ва ўсіх жыццёвых сферах. Вы здолееце прыняць важнае рашэнне, якое дазволіць лёгка перамясціцца на новы ўзровень прафесійнай запатрабаванасці. Дракон таксама зможа рэалізаваць нейкі праект, звязаны з мінулым вопытам. На працягу трох першых месяцаў 2014 года гэтая праца будзе патрабаваць неверагоднага напружання сіл і нерваў, затое прывядзе да буйной перамогі.



**ЗМЯЯ** *(1929, 1941, 1953, 1965, 1977, 1989, 2001, 2013)* у першыя месяцы года можа дазволіць сабе разнявольіцца і назіраць за падзеямі збоку — настолькі лёгка ў яе будзе ўсё атрымлівацца. Рэалізоўваць свае жаданні ўдасца, не ўступаючы ў супярэчнасць з тэндэнцыямі года. У Змей знойдзецца для гэтага дастаткова саюзнікаў і партнёраў, з якімі будзе дасягнута поўнае паразуменне. У другой палове года верагодныя буйныя перамены: магчымы пераезд ці набыццё нерухомасці, змяненне сямейнага статусу або хуткі рух па кар'ернай лесвіцы. Здабыты вопыт дапаможа зразумець, як дасягнуць сваёй мэты з найбольшай эфектыўнасцю і найменшым выдаткам сіл і часу.



Уласна **КОНЯМ** *(1930, 1942, 1954, 1966, 1978, 1990, 2002, 2014)* давядзецца пражыць год «у рэжыме паскоранай перамоткі», задзейнічаўшы свае скрытыя магчымасці і ўнутраныя рэзервы. Выдатны час для здзяйснення запаветных мар і кардынальных перастановак. Наогул, пераўтварэнні закрануць усе жыццёвыя сферы Каня, а любая яго асабістая ініцыятыва атрымае падтрымку нябёсаў. Адносіны з важнымі для вас людзьмі зменяцца, стануць больш адкрытымі. Пры гэтым вы зможаце дзейнічаць мякка, не аказваючы на партнёраў празмернага ціску. Менавіта ў гэты час для Коняў будуць адчынены ўсе дзверы і не давядзецца прастойваць на старце ў чаканні патрэбных людзей, дакументаў ды іншых сродкаў, неабходных для рэалізацыі задуманага.



Што да **КАЗЫ** *(1931, 1943, 1955, 1967, 1979, 1991, 2003)*, ёй удасца, нарэшце, вызваліцца ад ціску абставін, зразумець сваю самакаштоўнасць і не зрывацца з месца вокамгненна, як толькі некаму ад яе нешта спатрэбіцца. Адбудзецца гэта, да слова, вельмі своечасова, бо жыццёвыя сілы Казы ў пачатку года будуць практычна вычарпаны той барацьбой, якую яна вяла ўвесь папярэдні перыяд. 2014 год стане часам аднаўлення фізічнай і душэўнай энергіі, дазволіць адчуць лёгкасць быцця. Нават калі застануцца нейкія перажыванні, што цяперашні спакой ненадоўга, і бег па коле вось-вось пачнецца наноў, Каза атрымае адразу некалькі знакаў, якія пацвярджаюць яе поўную абароненасць на гэтым этапе. Самыя значныя і прыемныя падзеі 2014 адбудуцца ў міжасобасных стасунках: вы можаце пасябраваць з кім-небудзь на ўсё жыццё ці закахацца безаглядна (і, што немалаважна, узаемна).



**МАЛПАМ** *(1920, 1932, 1944, 1956, 1968, 1980, 1992, 2004)* давядзецца пераглядзець свае погляды ва ўсім, што датычыцца жыццёвых памкненняў і самадысцыпліны. Падзеі першых трох месяцаў года прадэманструюць, што прыйшоў час звярнуць пільную ўвагу на ўзаемаадносіны з іншымі людзьмі. Хутчэй за ўсё, галоўным прыярытэтам стане сям'я і ўсё, што звязана з роднаснымі сувязямі. Малпа на час забудзецца на свой эгаізм і возьме актыўны ўдзел у вырашэнні праблем блізкіх людзей. Гэта дапаможа многае зразумець аб сабе самой, а разам з тым, выправіць уласныя мінулыя памылкі, прычым зрабіць гэта непрыкметна і дзейсна. Некаторыя з вас прымуць рашэнне разарваць ранейшыя стасункі, нават калі яны доўжыліся працяглы час і абраслі моцнымі фінансавымі, духоўнымі і іншымі прывязкамі. Не шкадуйце аб тым, што перажыло свой час, але пастарайцеся зрабіць разрыў як мага менш балючым і як мага больш цывілізаваным.



**ПЕВЕНЬ** *(1921, 1933, 1945, 1957, 1969, 1981, 1993, 2005)* у гэтым годзе адчуе паскарэнне жыццёвых рытмаў і неабходнасць паскорыцца самому, каб паспець здзейсніць усё задуманае. Але вы памятаеце прыказкі наконт спешкі? Вось і не нарабіце памылак, бо негатоўнасць справіцца з абставінамі ўжо ў лютым можа прынесці значныя праблемы. Наогул, мноства негатыўных момантаў будзе звязана з нецярпімасцю і схільнасцю да бравады большасці Пеўняў, з-за чаго ў многіх справах давядзецца выконваць працу над памылкамі ці наогул перарабляць іх наноў. Толькі пасля гэтага з'явіцца адчуванне свабоды і магчымасць пачаць новы жыццёвы цыкл з улікам набытага вопыту. Словам, год прынясе вам тое, што вы самі сабе наклічаце, таму сачыце за ўласнымі словамі і ўчынкамі вельмі строга і прыдзірліва.



**САБАКУ** *(1922, 1934, 1946, 1958, 1970, 1982, 1994, 2006)* перапаўняе энергія, якая з некаторых прадстаўнікоў знака проста б'е фантанам. Уласна, яе невычэрпны запас і дазволіць дасягнуць большасці пастаўленых задач, тым больш што, у адрозненне ад мінулага года, 2014-ы абяцае быць дастаткова спрыяльным і беспраблемным. Праўда, перад тым, як кінуцца з усім імпэтам да новай справы, варта ўсё ж на хвілінку спыніцца і цвяроза ацаніць маштаб работы, магчымыя падводныя камяні і свае здольнасці — верагодна, давядзецца звярнуцца па дапамогу да кіраўніцтва, больш вопытных калег, сяброў ці блізкіх. Але гэта і добра, бо вашы стасункі з надзейнымі, вартымі даверу і павагі людзьмі ўмацуюцца, а тыя, на каго не варта разлічваць, яскрава праявяць сябе яшчэ ў самым пачатку, што дазволіць перарваць з імі стасункі лёгка для абодвух бакоў.



**СВІННІ** *(1923, 1935, 1947, 1959, 1971, 1983, 1995, 2007)* давядзецца шмат працаваць над сабой, каб не нарабіць памылак на роўным месцы. Многім з вас стане проста сумна, і ў гэтым стане адны пачнуць з усіх сіл «ажыўляць» стасункі з даўнім партнёрам, другія — актыўна шукаць новых знаёмстваў, што будуць не заўжды прыемнымі і карыснымі. Насамрэч трэба найперш уважліва ўгледзецца ў сваё адлюстраванне: адказ на пытанне, чаму ўсё складваецца так, а не інакш, і што варта змяніць, хаваецца менавіта там. Скарэктаваўшы ўласныя паводзіны, праявіўшы настойлівасць і паслядоўнасць ва ўсіх сваіх учынках, Свіння ажно да лістапада 2014 года зможа жыць, адчуваючы напоўненасць і асэнсаванасць кожнага дня, тым больш што блізкае кола людзей будзе вам у гэтым усяляк дапамагаць.

«Конь не любіць эгаістаў, гатовых ісці па галовах, і вельмі цэніць прыстойных, сумленных людзей, якія ў час прыходзяць на дапамогу не толькі блізкім, але і выпадковым сустрэчным, — нагадвае Аліна Волкава. — Улічвайце гэта, будуючы свае планы на год, і тады ён абавязкова будзе для вас паспяховым!».

**Вікторыя ЗАХАРАВА.**


**ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ**

**на встроенные помещения административного назначения в составе объекта «Многоквартирный жилой дом № 3 по генплану со встроенными помещениями административного назначения по ул. Острошицкой»**

Коммунальное унитарное предприятие «Управление капитального строительства администрации Первомайского района г. Минска» информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства

**Информация о застройщике:**

Коммунальное унитарное предприятие «Управление капитального строительства администрации Первомайского района г. Минска»

Зарегистрировано решением Минского городского исполнительного комитета от 15 октября 2004 г. № 2122 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190572712.

Адрес: 220012 г. Минск, пер. Калининградский, 17, тел. /факс 2873736. Режим работы: понедельник – четверг с 8.45 до 18.00, пятница с 8.45 до 16.45, обед с 13.00 до 14.00.

Объекты долевого строительства: магазин промтоваров, аптека, административно-офисные помещения в составе объекта «Многоквартирный жилой дом № 3 по генплану со встроенными помещениями административного назначения по ул. Острошицкой».

Жилой дом на 144 квартиры из 2-х 19-этажных секций (18 жилых этажей + цокольный этаж). Конструктивная схема жилого дома – монолитный каркас с наружными стенами из блоков ячеистого бетона.

Краткая характеристика встроенных помещений: все встроенные помещения запроектированы в цокольном этаже. Встроенные помещения имеют самостоятельные входы и изолированы от входа в жилую часть.

Для заключения договоров долевого строительства предоставляются:

- магазин промтоваров общей площадью 162,3 м².

Стоимость 1 кв.м общей площади – 2 105 $. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка на день платежа.

- аптека общей площадью 203,0 м².

Стоимость 1 кв.м 2 216 $. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка на день платежа.

- административно-офисные помещения общей площадью 163,0 м².

Стоимость 1 кв.м 2 130 $. Оплата производится в белорусских рублях по курсу Национального банка на день платежа.

Начало строительства многоквартирного жилого дома – ноябрь 2013 г., окончание – 1-й кв. 2015 года.

Возможна свободная внутренняя планировка, помещения запроектированы с независимым функционированием как жилой так и не жилой сопредельной территорией. На фасадной части здания возможно размещение рекламной вывески. Планируется комплексное благоустройство территории с рациональной пешеходной связью и транспортной обеспеченностью. Застройщиком получены:

- решение на строительство Минского городского исполнительного комитета «Об изъятии, предоставлении земельного участка и разрешении строительства» от 2 мая 2013 г. №1165;

- свидетельства (удостоверения) о государственной регистрации создания земельных участков и возникновения права временного пользования на них № 500/1323-2546. Свидетельство составлено 2 июля 2013 г.;

- заключение РУП «Главгосстройэкспертиза» № 1266-15/12 от 28.01.2013;

- разрешение инспекции Департамента контроля и надзора за строительством по г. Минску от 16.12.2013 года № 2-206Ж-054/13.

Заявления для заключения договоров создания объектов долевого строительства будут приниматься через семь дней после выхода проектной декларации по адресу: пер. Калининградский, 17.

Условия ознакомления застройщиком дольщиков с объектом долевого строительства и ходом работ по его строительству по адресу: пер. Калининградский, 17, по согласованию с Застройщиком.



**ОАО «ГОМЕЛЬХЛЕБОПРОДУКТ»**

извещает своих акционеров о проведении внеочередного общего собрания акционеров ОАО «Гомельхлебопродукт» 21 января 2014 года.

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. О даче согласия на увеличение доли Республики Беларусь в уставном фонде открытого акционерного общества «Гомельхлебопродукт».

Собрание состоится по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, актовый зал ОАО «Гомельхлебопродукт». Начало в 14.00.

С проектом решения собрания акционеры могут ознакомиться по адресу: г. Гомель, ул. Мазурова, 48, тел. (8 0232) 72 59 40.

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

*УНН 400010980* **Наблюдательный совет ОАО «Гомельхлебопродукт».**

Наш культурны асяродак

Жырандоля

Выпуск № 1 (218)

■ Выставы

# СУМАВАЦЬ ПА НОВЫМ ГОДЗЕ

**Да 2 лютага ў сталічнай галерэі сучаснага мастацтва «Ў» будуць сумаваць па Новым годзе. Сумаванне адбудзецца ў рамках выставы інсталяцый мастака Юрыя Шуста «Рэквіем па Новым годзе». На выставе можна будзе пераасэнсаваць розныя звыклыя атрыбуты свята Новага года, якое з язычніцтва перайшло ў хрысціянства, а сёння, наогул, мае дадатковыя прыкметы IT- і Hi-tech-рэчаіснасці. Так, напрыклад, ёлку мастак прадстаўляе ў вобразе ёршыка, такім чынам цалкам разбураючы ўсе існуючыя стэрэатыпы пра навагоднія ёлкі. Справа ў тым, што і навагоднія ёлкі, і ёршыкі, і нават некаторыя пахавальныя атрыбуты ствараюцца з аднаго і таго ж матэрыялу. Мастак Юрый Шуст узяў на сябе смеласць паставіць усе гэтыя рэчы, якія маюць розны рытуальны сэнс, у адзін шэраг. Ну, і, зразумела, прымусіць нас у чарговы раз задумацца пра адноснасць усяго існага, параўнальнасць непараўнальнага ды іншыя ўзаемавыключальныя паняцці суровай сучаснасці.**



Насамрэч упершыню выстава «Рэквіем па Новым годзе», толькі пад назвай Repetition/«Паўтор», прайшла ў кастрычніку 2012 года ў бельгійскім горадзе Гент у памяшканні, якое цяпер не выкарыстоўваецца. Гэта адзін з самых старых атэляў Еўропы — St. Joris, гісторыя якога пачалася ў XIV стагоддзі. А ў прастору галерэі «Ў» інсталяцыі Юрыя Шуста ўпісаліся зусім не горш. «Рэквіем па Новым годзе» — даніна адышоўшаму году і вітанне новага. І нездарма мастак звярнуўся менавіта да гэтага віду тугі. Здаецца, беларусы, будучы нацыяй абсалютна талерантнай, ускладаюць на гэтае свята шмат надзей: а раптам само ўсё нейк вырашыцца, «рассмокчацца», стане на свае месцы — шчыра, па справядлівасці, па заслугах і патрэбах. Ды потым не, аказваецца, што Новы год сам па сабе можа быць толькі штуршком для пераасэнсавання, а ніяк не вырашэннем праблем...

У апісанні выставы безапеляцыйна сцвярджаецца: «Свята Новага года — месца склейкі экзістэнцыяльнай пятлі, якое існуе на сутыку былога і будучага і азначана стрэлам феерверку, што спараджае новае жыццё калектыўнага цела. Новы год з'яўляецца найбольш значным рытуалам, сумесным перажываннем у сучаснай праваслаўна-атэістычнай Беларусі. Свята, якое прыйшло з язычніцкага мінулага, трансфармавалася хрысціянствам і мадэрнізавалася савецкай сістэмай. Свята, якое сумяшчае ў сабе грамадскае і персанальнае, здымае нарастаючае напружанне ў соцыуме і праграмуе яго будучыню. Падзея, што адсылае да трансцэндэнтнага і набывае ўнікальнае значэнне ў сённяшніх беларускіх умовах як трыумф парадку і дысцыпліны».

**Новы год сам па сабе можа быць толькі штуршком для пераасэнсавання, а ніяк не вырашэннем праблем...**

Здаецца, якраз пераасэнсаваць, ці такі ў нас парадак і ці неабходная такая жорсткая дысцыпліна, і заклікае нас мастак Юрый Шуст. Магчыма, яму збоку сталі больш відавочнымі некаторыя рысы беларусаў, якія мы самі ўжо развучыліся ў сабе заўважаць. Юрый хоць і нарадзіўся ў Маладзечне, але вучыўся і вось ужо колькі гадоў жыве ў Бруселі, сталіцы Бельгіі. У яго на Беларусь адтуль свой адметны погляд. Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя...

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■ Закуліссе

# НІБЫТА ГАДЗІННІКАВЫ МЕХАНІЗМ



## Як рыхтуюцца да спектакляў у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы

**Гучыць трэці званок — знак таго, што спектакль пачынаецца. Зараз выйдуць акцёры, гледачы будуць сачыць за іх жэстамі і мімікай. Пройдзе час — загучаць апладысменты... Гэта і ёсць тэатральны свет? Вядома, не толькі! Колькі ўсяго цікавага ў тэатры схавана ад вачэй гледача. Менавіта «закуліссе» дазваляе ўбачыць тэатр пад іншым вуглом. Што і захацелася зрабіць — праз падрыхтоўку да аднаго спектакля.**

...Набліжаюся да тэатра. На гэты раз заходжу ўнутр праз службовы ўваход. Да пачатку спектакля «Сымон-музыка» застаецца гадзіна. Іду па звілістых калідорах. Першыя дзверы вядуць у касцюмерную. Тут амаль усю прастору займаюць касцюмы. У галаву адразу прыйшлі словы пра тое, што тэатр пачынаецца з вешалкі. І не паспрачаешся!

Калі спектакль пачынаецца ў 19:00, то ў 16:00 касцюмеры ўжо працуюць з касцюмамі: іх прасуюць, разносяць па грымёрках ці выносяць бліжэй да сцэны, за кулісамі. Калі казаць менавіта пра спектакль «Сымон-музыка», то тут рыхтаваць адзенне да паказу даводзіцца не вельмі доўга. Справа ў тым, што ў часы, у якія развіваюцца падзеі спектакля, яе шылі з лёну, а кажухі выраблялі з натуральнай поўсці. Іх не прасавалі. У некаторых спектаклях бывае дастаткова апрануць акцёра толькі напачатку. У гэтым жа ў акцёраў шмат вобразаў, і касцюмеры дапамагаюць іх ствараць на працягу ўсёй пастаноўкі. Усё павінна быць прадумана: кожная дробязь, дэталь, гузік.

Наступны пакой — рэквізітарская. У памяшканні ляжыць шкура мядзведзя на падлозе, драўляныя кубкі стаяць каля хрустальных фужэраў, у вочы кідаюцца ліхтар і свечкі. Рэквізітам называюць як сапраўдныя, так і бутафорскія прадметы, якія выкарыстоўваюцца ў спектаклі. Мастакі і пастаноўшчыкі абдумваюць усе дэталі, каб стварыць адпаведны вобраз часу. Бутафорыю купляюць ці спецыяльна вырабляюць. Напрыклад, у спектаклі «Сымон-музыка» задзейнічаны драўляныя крыжы, колы, лодка, незвычайнай формы фартэпіяна і сейф, музычныя прылады, крылы. За дзве гадзіны да пачатку дзейства ўсё разносяць па месцах. Менавіта ў гэтым памяшканні мне распавялі рэцэпт «тэатральнай самагонкі»: акцёры насамрэч п'юць на сцэне ваду, афарбаваную малаком, ці напітак «Швепс».

У пакоі грымёраў — люстэркі, парыкі, касметыка. Мастакі па грыме распавялі, што іх праца таксама звычайна пачынаецца за дзве гадзіны да спектакля. На працягу пастаноўкі сюды па чарзе прыходзяць акцёры — у залежнасці ад часу іх выхаду на сцэну. Напрыклад, у спектаклі «Сымон-музыка» грым спачатку накладваюць вяскоўцам, потым галоўнаму персанажу Сымону, затым — бацьку і г.д. Сёння працуюць два прафесіяналы, для якіх у гэтым спектаклі асаблівых цяжкасцяў няма: трэба хіба што наклеіць вусы, бародку.





Да свайго выхаду акцёры рыхтуюцца ў невялікім памяшканні за сцэнай, якое завуць арт-фае: вісяць касцюмы, ёсць шырма, за якой можна пераапрануцца, стаяць крэслы. Тут увесь час знаходзіцца хтосьці з акцёраў, паўтарае свае рэплікі, уваходзіць у вобраз. У спектаклі «Сымон-музыка» галоўны герой — не проста натхнёны рамантык, ён улюбёны ў паэзію жыцця, музыку і музу, «дзівак», які задае пытанні і не чакае на іх адказаў. Ён ведае ўсе таямніцы свету і пакутуе пад іх цяжарам. Усе вобразы ў спектаклі яркія і глыбокія, таму і патрабуюць ад акцёраў стараннай працы над сабой.

Мае роздумы перапыняе гукарэжысёр: «Перад пачаткам спектакля адключыце, калі ласка, свае мабільныя тэлефоны...». Так наладжваюць гук. Бліжэй да сцэны заўважаю жанчыну з рацыяй у руцэ. Гэта Нэлі Самонава — памочнік рэжысёра. Пра сваю працу ў пастаноўцы яна кажа так:

— У мае абавязкі ўваходзіць праверка ўсіх дэкарацый, агульны кантроль за прыходам артыстаў на сцэну, падача сігналу асвятляльнікам, манціроўшчыкам на змену дэкарацый, якія могуць пачынаць ставіць ужо раніцай. Праз навушнікі і мікрафон звязваюся з гукарэжысёрамі, якім даю сігнал, каб яны выключылі святло. Гэтак жа аб'яўляем закулісную частку — напрыклад, калі трэба рыхтавацца да антракту. Дарэчы, суфлёраў у спектаклі «Сымон-музыка» няма. Перад яго пачаткам акцёры сядзяць у грымёрных ці арт-фае. Дзякуючы трансляцыі гуку яны ўсё чуюць і самі ведаюць, куды і калі ім выходзіць, але на ўсялякі выпадак я іх папярэджваю. Ёсць непрадбачаныя здарэнні, калі акцёры могуць перахваляваца на прэм'еры ці калі спектакль доўга не ішоў. Напрыклад, прэм'ера «Сымона-музыкі» адбылася яшчэ ў 2005-м, але яго не ставілі каля двух гадоў. Цяпер абнавілі, змяніўся і склад акцёраў: новыя твары і новая падача вобразаў. Рэпетыцыя прайшла днём, яе правёў рэжысёр. А мы выконваем арганізацыйную працу. Ператвараем «хаос закулісся» ў той стан, у якім спектакль выходзіць да гледачоў.

19:00. У зале людзі занялі свае месцы. Для іх уся гэтая вялікая праца за сцэнай застанецца непрыкметнай. У тэатры ўсё зладжана, як у гадзіннікавым механізме. Бо тэатр — гэта больш, чым проста сцэна!

**Алена ЛЯЎШЭНЯ.**
**Фота аўтара.**



## У ЧАКАННІ «ПАНА»

### Думкі Адама Міцкевіча загучаць з Купалаўскай сцэны

**Паэму «Пан Тадэвуш» вырашыў увасобіць на тэатральных падмостках галоўны рэжысёр і мастацкі кіраўнік Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Янкі Купалы Мікалай Пінігін. Спектакль, які даўно чакалі: Купалаўскі тэатр пасля рэканструкцыі павінен быў парадаваць гледачоў новай маштабнай і сур'ёзнай пастаноўкай на нацыянальную тэму.**

Словы Міцкевіча ў Купалаўскім тэатры загучаць па-беларуску: пераклад з польскай мовы зроблены Язэпам Семяжонам. Мікалай Пінігін лічыць, што «Пан Тадэвуш» — менавіта той твор, які зверне гледачоў да айчыннай гісторыі, тым больш, што падзеі паэмы адбываюцца на Наваградчыне. Але сваю краіну Міцкевіч называе Літвой. Чаму? Трэба тлумачыць сучасным грамадзянам Беларусі, і гэтую задачу таксама паставіў перад сабой рэжысёр. Яму дапамагаў у гэтым Сяргей Кавалёў, які зрабіў інсцэніроўку паэмы для тэатра. Стварыць вобраз часу на сцэне прыцягнуты мастак-пастаноўшчык Зіновій Марголін і мастак па касцюмах Алена Ігруша. Музыку да спектакля стварыў Андрэй Зубрыч.

Гэты паэтычны твор Міцкевіча ўпершыню ўвасабляецца на драматычнай сцэне ў Беларусі. Таму прэм'ера, прызначаная на сярэдзіну студзеня, чакаецца з заміраннем сэрца.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

■ Сцежкамі мастака

# ЦІМОХАВА ЦІШЫНЯ

**У Выдавецкім доме «Звязда» выйшаў альбом рэпрадукцый мастака Сержука Цімохава. Творца пайшоў з жыцця пасля цяжкай хваробы 9 кастрычніка 2012 года... Але калі разглядаеш карціны Цімохава, гартаеш альбом з яго творамі, знаходзіш у тэлефонным нататніку яго нумар (па якім цяпер можна патэлефанаваць хіба што тузе ды смутку, напэўна...), разумееш, што кожны чалавек непазбежна нешта пакідае на гэтай зямлі пасля сябе. Сяржук Цімохаў пакінуў цэлы свет.**



З нізкі «Ню».

Персанальны свет кожнага чалавека, як правіла, вельмі спрэчны для вонкавага асяроддзя. Проста таму, што ён — іншы. Таму што кожны ўнутры сябе носіць свой свет. Таксама адрозны. І як тут знайсці паразуменне?.. Гэта сапраўды амаль немагчыма. Часам толькі мова мастацтва яднае, дапамагае. Але нават яна можа быць недасканалай...

Сяржук Цімохаў з тых прадстаўнікоў беларускага мастацтва, якіх натхнілі 1970 — 1980-я гг. У гэтыя «постадлігаўскія» часы было нейкае асаблівае стаўленне да ўсяго беларускага, усе беларускамоўныя ведалі адно аднаго, усе прагнулі нешта змяніць, усе адчувалі нястачу нацыянальнага і гэты прагал трэба было нечым запоўніць. Запаўнялі хто чым мог. Сяржук Цімохаў запаўняў сваёй роднай беларускай мовай, натуральным, вясковым адчуваннем беларускасці.

Мастак нарадзіўся ў 1960 годзе ў вёсцы Кротаў Калінкавіцкага раёна Гомельскай вобласці. Ён часта прыгадваў, як цяжка яму было перавучыцца размаўляць па-руску, калі паступіў у Мінскае мастацкае вучылішча. Голад па нацыянальным, па беларушчыне Сяржук Цімохаў таксама запаўняў гісторыяй. На яго карцінах «Золак Купальскае ночы», «Гуканне вясны», «Стод», «Рытуальнае шэсце», «Спас», «Каляды», «Грунвальд», «Світанак», «Цень Вялеса» — успаміны пра пракаветнае. Ва ўсіх гэтых карцінах ёсць нешта аўтэнтычнае, каранёвае. Бацькоўская хата, асобы беларускай даўніны, без якіх не захавалася б нават тое, што засталося нам сёння ад беларушчыны, старадаўнія абрады, звычкі нашых дзядоў, вобраз жанчыны... Па настроі, па нейкай экзістэнцыяльнай тузе, якая сёння ўжо амаль зусім выйшла з моды і перастала ўспрымацца як нешта глыбокае, некаторыя карціны Цімохава нагадваюць «Гумно» Барыса Заборава. Дарэчы, цікава, што сам мастак таксама гэта адзначаў. З агаворкай, што пабачыў карціну Заборава ўпершыню даволі позна. І хаця Забораў наогул з'еxаў з краіны, а Цімохаў толькі пераехаў з вёскі ў горад, было ў іх, відаць, нешта агульнае — нейкая настальгія, прадчуванне незваротнасці, невяртання ў родныя мясціны, дзе адчуваеш сябе найбольш утульна і абаронена.

Карціны Сержука Цімохава такія мінімалістычныя, што часам здаецца, што расказаць пра іх ён мог значна больш, чым намаляваць. Яго філасофскі падмурак, мыслярства былі працягам візуальнай творчасці. Ён мог доўга распавядаць пра архетып яйка ў сваіх карцінах, пра вобраз стодаў альбо пра тое, чаму на яго карцінах шмат жанчын і птушак. А насамрэч — чаму? Звярніцеся да альбома, пераасэнсуйце!

Альбом складаецца з трох асноўных раздзелаў — «Графіка», «Жывапіс», «З нізкі «Ню» — і дае ўяўленне пра асноўныя кірункі творчасці мастака-манументаліста. Укладаннем альбома займалася ўдава мастака, кніжны графік Маргарыта Цімохава. Дызайн альбома рабіла дачка Вольга Арцюхова. Наогул, сям'я Цімохавых вельмі творчая. 15-гадовы сын мастакоў Глеб цяпер вучыцца ў гімназіі-каледжы мастацтва ў Мінску. Спалучаць творчасць з сямейным жыццём не было складана. Чаму — распавядае Рыта Міхайлаўна:

**Сяржук Цімохаў з тых прадстаўнікоў беларускага мастацтва, якіх натхнілі 1970 — 1980-я гг. У гэтыя «постадлігаўскія» часы ўсе беларускамоўныя ведалі адно аднаго, усе прагнулі нешта змяніць...**

— Мы ўсе працуем у розных кірунках мастацтва. Муж займаўся манументальным мастацтвам, я — кніжнай графікай, дачка — дызайнам і фотамастацтвам, а сын, наогул, нядаўна заявіў, што хоча быць мадэльерам, дызайнерам адзення. Таму мы ніколі не перасякаліся ў творчасці і не спаборнічалі паміж сабой.

Калі гаварыць пра тое, што натхняла Сержука Цімохава, то нельга не прыгадаць, напрыклад, і Беларускую спеўна-драматычную майстроўню, якая існавала ў Мінску з 1979-га па 1984 год. Тады ён быў студэнтам Беларускага тэатральна-мастацкага інстытута. Тады ж назіраўся і ўздым нацыянальнага руху, пра які ўзгадвалася вышэй. Майстроўня стварала пэўны асяродак, фарміравала новае пакаленне, выкрышталізоўвала яго каштоўнасці. Наноў адкрываліся імёны класікаў — такіх, як Уладзімір Караткевіч; віталіся маладыя эксперыментатары — такія, як паэт Алесь Разанаў і кампазітар Ларыса Сімаковіч. Сябры Майстроўні не забываліся пра беларускія абрады, хадзілі калядаваць, гукаць вясну, праводзілі абрады Купалля і «Пахаванне стралы». Тады яшчэ здаралася, што за ўдзел у такіх акцыях маглі з інстытута выключыць, таму справа гэтая была досыць рызыкоўная, ідэйная. А беларускамоўных мастакоў можна было пералічыць па пальцах. І Сяржук Цімохаў быў сярод іх. На адраджэнскай хвалі 1990-х мастака запрасілі ў суполку «Пагоня» пры Саюзе беларускіх мастакоў. Але пазней мастак быў вымушаны з яе выйсці. Бо ў апошнія гады жыцця Цімохаў быў яшчэ і пры пасадзе, як той казаў, і яго маглі абвінаваціць у лабіраванні інтарэсаў суполкі. Сяржук Цімохаў працаваў намеснікам старшыні Саюза мастакоў па выставачнай дзейнасці. І шмат у яго пыталіся пра тое, ці цяжка яму было спалучаць творчасць з функцыянерствам. Здаецца, на цяжкі лёс мастак ніколі не скардзіўся, але адзначаў, што часу на творчасць, вядома, стала менш, быццам бы зацішша нейкае наступіла. Сярод добрых сяброў мастака быў, дарэчы, і новы старшыня Саюза беларускіх мастакоў Рыгор Сітніца. У альбоме рэпрадукцый Цімохава змешчаны таксама верш Рыгора Сямёнавіча ў памяць пра сябра. Сапраўды, што наканавана людзям, якія застаюцца тут, на зямлі, — хіба што прыслухоўвацца да цішыні, якую пакінуў пасля сябе той, хто сышоў. Ціхі, павольны і добразычлівы свет Сержука Цімохава супакойвае. Ёсць у ім нешта стваральна-станоўчае, без чаго немагчыма ўявіць мастацтва.



Фотаздымак Сержука Цімохава з альбома рэпрадукцый.

Завяршае альбом раздзел пад назвай «З нізкі «Ню». Гэта манументальныя графічныя творы, аб'яднаныя адной канцэпцыяй. На кожнай карціне мы бачым аголеную жанчыну — вытанчаную і таямнічую. Менавіта гэтая нізка мастака сталася найбольш вядомай за свой вытанчаны лірызм і паэтычнасць. Сам Сяржук Цімохаў тлумачыў гэтую нізку роздумамі аб прыродзе язычніцтва — рэлігіі простых вясковых людзей. Усё, што тычылася прыроды наогул і прыроды чалавека і яго адчуванняў заўжды цікавіла мастака. За сваю шчырасць, талент і адданасць «родным матывам» Сяржук Цімохаў быў прызнаным і запатрабаваным як на радзіме, так і за мяжой — на жаль, даволі рэдкі выпадак для Беларусі. Мастак меў вялікую колькасць персанальных замежных выстаў, шмат яго твораў захоўваецца ў іншых краінах.

**Вольга ЧАЙКОЎСКАЯ**

■ Запрашальнік

## ПАД ГУКІ ПАЛАНЭЗА

### Баль як згадка пра былое і цікавінка сучаснасці

**Новы год па старым стылі прапануюць сустрэць у Вялікім тэатры. Пяты год дзякуючы гэтай тэатральнай ініцыятыве Мінск мае свае бальныя традыцыі, адноўленыя сёння.**

З мінуўшчыны вяртаюцца танцы, у якіх пары праходзяць уздоўж доўгага фае тэатра — дамы ў доўгіх святочных сукенках і кавалеры ва ўрачыстых строях. З сучаснасці — самі ўдзельнікі, якія да балю спецыяльна рыхтуюцца: наведваюць урокі танцаў і падбіраюць строі. За адну ноч можна наведаць адразу некалькі баляў: княжы (у беларускай традыцыі), рускі і венскі. За гады правядзення баляў у оперным тэатры іх аматары ўжо ведаюць, у чым адрозненні кожнага. Танцмайстрам сёлета прызначана Наталля Фурман, якая будзе задаваць тон шматлікім парам.

Але Новы год па старым стылі ў Нацыянальным тэатры оперы і балета — гэта яшчэ магчымасць атрымаць адчуванне свята сустрэч з творчасцю і творцамі: у гэты вечар у тэатры працуюць салоны, музычныя гасцёўні, праводзяцца конкурсы. Але самае галоўнае адбываецца ўсё ж такі на вялікай сцэне — святочны гала-канцэрт з удзелам салістаў оперы і балета. Галіна Галкоўская, якая з'яўляецца рэжысёрам-пастаноўшчыкам пятага па ліку балю ў оперным тэатры, абяцае, што ён пройдзе з асаблівым размахам і з сюрпрызамі. Які ж Новы год без нечаканых падарункаў?

**Ларыса ЦІМОШЫК**

## «ЗІМА-2014. АНЁЛЫ»

**У Віцебскім абласным краязнаўчым музеі адкрыліся выставы дзіцячага малюнка, папяровай пластыкі «Зіма-2014. Анёлы» і самаробнай цацкі.**



Экспанаты з выставы.

Аўтары экспанатаў першай з выстаў — вучні дзіцячай мастацкай школы г. Віцебска. Творчыя работы перадаюць дзіцячыя ўяўленні аб навагоднім чараўніцтве, усяляюць надзею на ажыццяўленне мары чалавека, які верыць у цуд. Здаецца, што анёлы ахоўваюць нас ад мітусні і смутку, абсыпаюць зорачкамі шчасця і радасці.

А смачныя ўпрыгажэнні зрабілі выхаванцы віцебскага Палаца дзяцей і моладзі, гарадскога цэнтра дадатковай адукацыі, Палаца творчасці. На ёлцы — больш як 60 цацак: саламяныя конікі і зоркі, сняжынкі з бісеру, казачныя домікі і снегавікі, кацяняты і вожык, розныя кветкі, і зноў жа... анёлы.

Экспанаты можна ўбачыць у будынку ратушы (гэта сімвал старажытнага Віцебска) да старога Новага года, прычым бясплатна.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# УП «МИНСКИЙ ГОРОДСКОЙ ЦЕНТР НЕДВИЖИМОСТИ»

**31 января 2014 г. проводит повторный открытый аукцион № 02-А-14 на право заключения договоров аренды земельных участков в г.Минске**

**Вид аукциона:** открытый (на повышение начальной цены). **Предмет аукциона:** право заключения договора аренды земельного участка. Аукцион проводится в порядке, установленном постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462.

**На торги выставляется право аренды сроком на 99 лет 20 земельных участков для строительства и обслуживания одноквартирных, блокированных жилых домов в г.Минске:**

| № предмета аукциона | Месторасположение земельного участка | Кадастровый номер земельного участка | Площадь, га | Начальная цена предмета аукциона (бел. руб.) | Сумма задатка (бел. руб.) | Расходы на подготовку документации для проведения аукциона (бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 15 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006626 | 0,0827 | 533 974 720 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 2 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 16 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006627 | 0,0827 | 533 974 720 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 3 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 17 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006628 | 0,0827 | 533 974 720 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 4 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 18 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006629 | 0,0827 | 533 974 720 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 5 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 19 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006630 | 0,0827 | 533 974 720 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 6 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 20 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006631 | 0,0820 | 529 454 720 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 7 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 22 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006646 | 0,0832 | 537 202 000 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 8 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 23 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006632 | 0,0832 | 537 202 000 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 9 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 24 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006633 | 0,0832 | 537 202 000 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 10 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 27 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006634 | 0,0808 | 521 707 440 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 11 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 28 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006645 | 0,0809 | 522 349 280 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 12 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 29 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006644 | 0,0808 | 521 707 440 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 13 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 30 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006635 | 0,0809 | 522 349 280 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 14 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 31 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006636 | 0,0809 | 522 349 280 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 15 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 32 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006637 | 0,0809 | 522 349 280 | 60 000 000 | 7 161 720 |
| 16 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 33 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006638 | 0,0976 | 630 178 400 | 70 000 000 | 7 161 720 |
| 17 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 35 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006639 | 0,0987 | 637 283 840 | 70 000 000 | 7 161 720 |
| 18 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 36 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006640 | 0,0980 | 632 763 840 | 70 000 000 | 7 161 720 |
| 19 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 37 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006641 | 0,0973 | 628 243 840 | 70 000 000 | 7 161 720 |
| 20 | ул. Проектируемая № 1 – пер. Ермака – ул. Зацень (№ 38 по ПДП д. Зацень) | 500000000007006642 | 0,0978 | 631 471 120 | 70 000 000 | 7 161 720 |

Сведения о наличии инженерных коммуникаций на указанных земельных участках содержатся в составе землеустроительной документации.

Инженерное развитие инфраструктуры застраиваемой территории осуществляется в соответствии с техническими условиями на инженерно-техническое обеспечение соответствующего объекта, выданными эксплуатирующими и согласующими организациями.

**Аукцион состоится 31 января 2014 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, зал аукционов.**

**Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона:**

внесение платы за земельные участки;

возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения;

обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Минское городское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок после подписания договора аренды земельного участка;

получение победителями аукциона в установленном порядке технической документации и разрешения на строительство жилого дома;

занятие земельных участков (осуществление строительно-монтажных работ) осуществить гражданину – не позднее одного года, юридическому лицу, индивидуальному предпринимателю – не позднее 6 месяцев со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство одноквартирного, блокированного жилого дома.

**Для участия в аукционе необходимо:**

**внести задаток (задатки) не позднее 27 января 2014 г.** в вышеуказанном (графа 6 таблицы) размере (в случае участия в торгах в отношении нескольких земельных участков – задаток вносится для каждого из предметов аукциона), перечисляемый на расчетный счет № 3641000000016 в ОАО «АСБ Беларусбанк», код банка 795, УНП 100690830, назначение платежа 04002, получатель – главное финансовое управление Мингорисполкома (задатки вносятся в белорусских рублях в суммах, согласно настоящему извещению);

**представить в УП «Минский городской центр недвижимости» – организатору аукциона следующие документы:**

заявление на участие в аукционе;

документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков), с отметкой банка;

подписанное соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах) установленной формы, включающее обязательство по уплате в соответствии с законодательством штрафных санкций и иные требования;

**дополнительно представляется:**

гражданином – копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования;

индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;

представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – нотариально удостоверенная доверенность;

представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии устава и свидетельства о государственной регистрации юридического лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;

представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, легализованные в установленном порядке доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык;

представителем иностранного гражданина – легализованная в установленном порядке доверенность, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе граждане, представители граждан, индивидуальных предпринимателей и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

**Прием документов, консультации по вопросам участия в аукционе и ознакомление с имеющейся документацией осуществляются по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. № 6, с 16 января 2014 г. по 27 января 2014 г. включительно в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 18.00 (по пятницам до 16.45).**

Торги в отношении каждого земельного участка проводятся при условии наличия двух или более участников. Победителем торгов по каждому предмету аукциона признается участник, предложивший наиболее высокую цену.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся, до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка обязан:

- внести плату за предмет аукциона (часть платы – в случае предоставления рассрочки ее внесения);

- возместить Минскому горисполкому расходы по подготовке документации для проведения аукциона;

- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона;

- возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. **Информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись и оплачивается по предоставляемому организатором аукциона счету-фактуре.**

После совершения названных действий, но не позднее 2 рабочих дней, Минский горисполком на основании решения об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся, заключает с победителем аукциона либо единственным участником несостоявшегося аукциона договор аренды земельного участка сроком на 99 лет.

Оплата стоимости предметов аукциона осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. По заявлению победителя аукциона Минский горисполком предоставляет рассрочку внесения платы за предмет аукциона. Указанное заявление подается победителем аукциона в Минский горисполком не позднее одного рабочего дня после утверждения протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона либо единственный участник несостоявшегося аукциона (юридическое лицо, индивидуальный предприниматель в предусмотренных законодательством случаях в течение 6 месяцев, а гражданин в течение 1 года со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта) должен приступить к занятию земельного участка (начать строительство – осуществление строительно-монтажных работ в соответствии с утвержденной проектной документацией) в соответствии с целью и условиями его предоставления. В случае невыполнения данного требования право пользования (аренды) земельного участка прекращается в установленном порядке.

